**Віктар Шніп**

# На рэштках Храма

Вершы

Мінск
"Мастацкая літаратура"
1994

## ДА БОГА МАЯ АДЛЯТАЛА ДУША...

### Балада пра нешляхетнага пана

Нібыта ў турме, у бялюткім палацы
Жыў пан нешляхетны, выбраннік Багоў.
Не мог ён халопскае мовы цурацца,
За што й адракліся сябры ад яго.
Ён кніжкі чытаў і пісаў у газеты
Аб тым, што патрэбна людзей вызваляць
Ад рабства і Бог нам даруе за гэта
Грахі. І аб тым, што належыць зямля
Людзям, на якой іх дамы і магілы,
Зямля, на якой гаспадарыць чужак
У кроўным хаўрусе з нячыстаю сілай,
Мяняе людзей на заморскіх сабак...
Халопам сваё раздаваў ён багацце,
Ды толькі ніхто анічога не ўзяў.
— Чаму ж анічога не хочуць узяці?! —
Нібы звар'яцелы, начамі крычаў
І грошы паліў у чарнюткім каміне.
З іконаў халодна глядзелі Багі —
Аж нават мурашкі хадзілі па спіне
Ад іхніх паглядаў. Чарнеў ад тугі
І марыў пра роўнасць людскую да рання,
А ўранні ішоў у мястэчка ў царкву
І, нібы фанатык, маліўся старанна,
У Бога пытаўся: «Чаго я жыву,
Калі не патрэбны я тут анікому,
Калі не патрэбны багацці мае
Народу, што моліцца пану дурному,
Якому нат смерці ты, Бог, не даеш?..»
І позна вяртаўся з мястэчка бяссілы,
І долю і волю сваю праклінаў.
Стаяў на каленях ля склепа-магілы,
Каменне, як рукі, на ім цалаваў.
Прасіў даравання ў нябожчыцы маці
За тое, што стаў мужыкам патакаць,
За тое, што ўсё разбазарыў багацце
І праўду пачаў у газетах шукаць.
І кляўся, што мову халопаў забудзе,

Ізноўку набудзе сяброў-панічоў...
Але ж і назаўтра ён думаў аб людзях,
Пісаў у газеты пра лёс мужыкоў.
Цікаўным прыезджым халопы казалі:
— Наш пан нешляхетны, але неблагі...
Яго за дзівацтвы паны праклінялі,
З іконаў з пашанай глядзелі Багі.

**Балада карліка**

Закахаўся карлік у князёўну,
Перад Ёю ходзіць на руках.
Для князёўны гэта — усё роўна,
Смешны карлік ты ў Яе вачах.

І Яна смяецца аж рагоча,
І цукеркі кідае — служы.
Ну а ты глядзіш па-рабску ў вочы,
Да ўсяго гатовы — нат не жыць.

Па начах партрэт Яе малюеш
І цалуеш, як Яе, партрэт.
За каханне сам сябе лупцуеш
І клянеш праклаты гэты свет.

У акно ты Ёй кідаў букеты,
І князёўна цалавала іх.
Ты ж з кустоўя паглядаў на гэта,
Выбегчы гатовы кожны міг.

Раўнаваў да кожнага мужчыны,
Нават да партрэтаў на сцяне.
Колькі раз каханне да адзінай
Ты тапіў, самотны, у віне.

І цяпер для смеху перад Ёю
Бегаеш, нясмешны, на руках
І трасеш, як цацкай, галавою,
Шаргунок галосіць у зубах.

Не стрываўшы рабскае пакуты,
Кінуў шаргунок у ейны смех,
І з налаца, нібы звер той люты,
Ты на волю і на смерць набег.

...Год прайшоў як век. Цябе не помняць.
Топча кат, нібы святар, зямлю.
Толькі сняцца карлікі князёўне,
Дзякуюць за моцную пятлю.

**Спальванне ведзьмака**

І людзі скачуць ля агню.
Агонь галодны, як і людзі.
І смаляць іскры вышыню,
І Бога ў белай хмары будзяць.

Не чалавек — вядзьмак гарыць.
З-за ведзьмака пасохлі травы,
І звар'яцелыя звяры
Равуць — няма на іх управы.

З-за ведзьмака няма вады
У студнях, высахлі крыніцы.
— Ратуй жаг Божа, ад бяды! —
Звіняць да Бога ўсе званіцы.

Адкуль жа ўзяўся ў вас вядзьмак?
Маўчаць усе — ніхто не знае.
Знайшлі, і ўсё — маўчы, дзівак,
А то й цябе агонь спазнае.

І скачуць людзі ля агню,
Нібыта ў чорным пекле чэрці.
Вядзьмак ляціць увышыню
На крыллях вогненных да смерці.

І людзі радасна крычаць,
Ажно на лоб вылазяць вочы.
А заўтра будуць зноў шукаць

Нячыстага, што Край сурочыў.

Гарыць агонь, ажно кіпіць,
Нібы вар’ят, з людзямі скача.
І Бог у белай хмары спіць,
І над людзьмі нячысцік плача.

**Балада здрадніка**

Я сябе хацеў агню аддаць,
Не нрыняў агонь, а плюнуў злосна
Іскрамі-крывёй у твар. Відаць,
Жыць мне вечна здраднікам,
і млосна
Мне глядзець на свежыя крыжы,
Пад якімі родныя спачылі.
Хто жывы, вы кідайце глыжы
У мяне, каб да начы — забілі!
Ды нідзе нікога не чуваць,
Нат чужынцаў не відно на конях.
Толькі стогне чорная трава,
Па якой прамчалася пагоня.
Я сябе хацеў аддаць вадзе,
Уцякла вада далёка ў спраты.
Нат атруты не знайшоў нідзе,—
Пагарэла, як гарэлі хаты.
...І блукае здраднік па палях,
Смерць, нібы ратунак свой, шукае.
І ўцякае ад яго гіятля,
І асіна ад яго ўцякае.

**Горад №, 20-я гады**

Не змыты крывавыя плямы
На пляцы на бруку сівым.
Вітрыны разбітыя ў крамы,
Крыжы паламаны ў царквы.

У горадзе голад і холад,

Плакаты, салдаты, сцягі.
Як рана крывавая горад,
Засмяглі ў ракі берагі.

Зладзюгам жыццё як маліна.
Гарэлка ракою, табак.
«Мо, пану, ахвота жанчыну?”--
Жанчын прапануе паляк.

Вагоны паўнюткія жыта
На захад імчаць цягнікі.
Ля горада ў лесе бандыты,
У горадзе — бальшавікі.

Народ пераменаў чакае,
Сагнутаму — іх не відаць.
Па радыё музыка грае,
І клічуць шпіёнаў шукаць.

Жывуць беларусы і вераць
У светлы і праведны дзень.
А дзень, нібы воблака, шэры
У Заўтра кідае свой цень.

Не змыты крывавыя плямы
На пляцы на бруку сівым.
Вітрыны разбітыя ў крамы,
Крыжы паламаны ў царквы.

**Язэп Драздовіч**

Па Белай Русі ў світцы белай,
У пыле зорак і дарог
Ідзе, задумны, пасівелы,
Вандроўнік — мудрых фарбаў Бог.
Чароўны кій вядзе па свеце.
А родны край як родны дом.
— Дзівак! — з яго смяецца вецер,—
Усё што зробіш — стане тлом!
Сядзеў бы дома і партрэты

Жанкам вясковым маляваў,
Меў торбу б грошай ты за гэта,
І не балела б галава
За мову мужыкоў тутэйшых.
Дзівак! Ты верыш у сусвет!
Хапала ў свеце разумнейшых.
Ды дзе яны? Усе ў траве.
Чужых дзяцей любіць — прыгожа.
А дзе свае? Маўчыш, стары?
Павалішся — а хто ж паможа
Устаць? Загінеш без пары!
Не слухаеш — то не разумна!
Хаця ідзі, раз выбраў шлях.
Твой шлях зямны — цяжкі і сумны,
Твой лёс — як поле ў камянях...
Махнуў рукой на гэта смела,
Свой кінуў цень на крыж дарог
І ў люд пайшоў па Русі Белай
Вястун, паэт, мастацтва Бог.

**Балада апошняга рыцара,**
**які трапіў у чарнобыльскую зону**

Апошні рыцар Беларусі сумнай
Праз поле едзе на кані сівым.
Тупая дзіда, без шчыта, задумны,
Сто раз паранены, але жывы.
Смяротны вецер гойсае па полі,
Якое ад чужынцаў ратаваў.
Душа крычыць ад незямнога болю,
Ад дум зямных цяжэе галава.
Заплакаць час — ды рыцары не плачуць.
Жыцця нячутна, быццам быў памор
І ўсе памерлі, толькі цені скачуць
І крылле крыжам воран распасцёр.
Крыжасты цень плыве па жоўтых травах
І ў травах Гады моляцца, каб жыць.
Ты зведаў сорам, і ты зведаў славу,
Цябе спазналі дзіды і нажы.
Тут і цяпер змагацца ты гатовы:

— Выходзь, чужак, за гора адказаць!
Крычыш, лятуць над мёртвым краем словы.
Як на вар’ята каты ўслед глядзяць,
Што ў норах пазашыліся лісіных.
— Тут можна сеяць хлеб і багацець!
Рыпяць у свет бязмозглыя машыны.
Спрачацца з імі — трэба звар’яцець.
Ты дзіду ўпэўнена ў руцэ трымаеш:
— Ану хутчэй выходзь жа, ліхадзей!
Ці знойдзеш ты яго? Ніхто — не знае.
Смяротны вецер голадна гудзе...

**Валуны**

Калі спявалі валуны,
То й люд бярог бацькоўску мову.
Маўчаць халодныя яны,
Як храмаў медныя галовы.

Трава паўзе па валунах,
Хавае іх ад злога вока.
І чорны воран, як манах,
Іх сцеражэ, глядзіць здалёку.

Пад валуном жыве змяя
І сніцца ёй: яна багіня.
І да змяі ідзе жняя,
І нехта з іх праз міг загіне.

Але пакуль няма бяды,
Адзін, як лёс, над валунамі
Лятае з раю Дух святы,
Звініць пакутна ланцугамі.

Калі ж сустрэнуцца Яны,
То лес сухі залямантуе
І заспяваюць валуны...
Ды толькі хто ў нас іх пачуе?

* * *

За чорным полем белы Замак,
Там доля шчасная жыве.
А ля яго, як пекла, крама
І косці белыя ў траве.
Усе спяшаліся здурэла
У краму, як у вечны рай,
Куплялі кільку і гарэлку,
Не думалі пра родны Край...
І я пайшоў у Замак полем,
За мной струменіла Змяя.
Калі загіну — дык то доля
Такая божая мая.
І цень застаўся мой на ўзмежку,
Малітвы д'ябалавы шаптаў
І ўслед свяціў гнілой усмешкай,
І ў небе д'ябал рагатаў...
...І што было б далей — не знаю,
Калі б не Вецер прыляцеў
І не падняў мяне над Краем,
І ўбачыў я: мы ў цемнаце...
Ды Вецер сціх, і я спусціўся
З нябёс на грэшную зямлю.
Крумкач над чорным полем віўся
І ў дзюбе нёс маю Змяю.
І я сказаў:— Зірніце, людзі,
Вы ў цемнаце тут цэлы век...
І чорны гостры нож у грудзі
Загнаў мне карлік-чалавек.

**Казка пра цмока**

У сцюдзёных, як лютыя зімы, скляпеннях,
У цямнечы гнілой, закаваны ў ланцуг,
Цмок сядзіць і грызе звар'яцела каменне,
І жыве ў ім нячысты няскораны дух.
Цмок да волі ірвецца, як травы да сонца,
Чорнай помстай кіпіць звадзянелая кроў.
Цмок крычыць і раве невыносна-бясконца —
Аж трасецца зямля. Разлятаецца роў

Па Айчыне маёй, жахам поўнячы душы.
Цмок жа не вінаваты сягоння зусім,
Што жыве чалавек, нібы цень той, нядужы,
Д'ябал смела лятае, рагоча над ім.
Ды ўсё роўна гавораць, што цмок вінаваты.
Хто гаворыць вось так, той не лепшы, чым цмок,
Той не бачыць на вокнах турэмныя краты,
На дзвярах той не бачыць турэмны замок.
Цмок крычыць і раве, ды няма ў яго сілы,
Каб парваць свой ланцуг і на волю пайсці.
І скляпенне ўсё ж стане ягонай магілай,
І магілы яго нам павек не знайсці.
Не знайсці, каб валун на магіле пакласці
І на тым валуне на вякі напісаць:
«Тут ляжыць наша рабскае бруднае шчасце!
Больш не дайце сябе падмануць, зваяваць!"
І пакуль цмок жывы, праклінайце, судзіце
Вы яго. Нам яго і клясці і судзіць.
Ды падчас на суседа свайго паглядзіце -
Ці не цмокаў намеснік тут з вамі сядзіць
Цмок да волі ірвецца і волю губляе,
І слабее яго невыносліві роў.
Д'ябал смела над намі, як доля, лятае,
І сцякае па кіпцях нявінная кроў.

* * *

У ката закахалася паненка,
З дурною смерцю заручоны кат.
Яму паненкі свецяцца каленкі,
Яму паненкі ласкавы пагляд.

А ён, як ноч, пасля работы чорнай
Глядзіць у кубак, дзе, як кроў, віно.
Душою адзінокі, быццам воран,
Каханнем не цікавіцца даўно.

На шыі крыж вісіць не цалаваны,
І крыж цяжкі схіляе галаву.
Ты кат, але ці позна а ці рана
І ты таксама сыдзеш у траву.

Цябе не знаюць тут, і ты шчаслівы,
Відаць, каб зналі, дык не жыў даўно б.
Усім тут абыякава надзіва:
Ці кат, ці князь ты, ці зусім гаўно.

Наіўная, спакусніца-дурніца,
Не знаеш ты, што ён такім, як ты,
Галовы сек, што вылі, як ваўчыцы,
Ліў волава ў галодныя раты.

Паненка коткай круціцца ля ката,
Яго асвечвае святлом грудзей.
А ён сядзіць, нібы валун пракляты,
Вачмі маланкі кідае ў людзей.

Яна злуецца і гарыць без дыму:
«Не буду жыць, калі не спакушу.
Забудзе ён і жонку і Радзіму
І вырве мне з грудзей сваю душу!»

Ён кат, але ж і чалавек таксама.
І падхапіўся ён і ў ноч пабег:
«Не дай мне звар'яцець старому, мама!"
Гайнёй сабак ляцеў за катам смех.

А крыж на шыі біўся як шалёны,
Душу з грудзей ссівелых выбіваў.
Прачнуліся на могілках вароны,
І вартаўнік спалоханы сканаў.

Кат бег да смерці ад жыцця здзічэлы
І ўсюды бачыў чарапы і кроў.
Паненкі цела голае ляцела
На чорным, як той свет, крыжы мячоў.

**Казка пра ляльку**

Табе з гразі зляпілі трон
І абяцалі даць карону.
Сядзіш, палохаеш варон,

Сама падобна на варону.
Сярдзіта на людзей глядзіш,
Цябе не заўважаюць людзі.
І толькі мыш, рудая мыш
Каля цябе стаіць у брудзе.
І ёй выгодна так стаяць.
Яна цяпер да ўлады блізка.
Без трона лепей цараваць.
Сядзець на троне вельмі слізка.
А ляльку лёгка замяніць,
А ляльку вінаваціць проста,
Калі ж яна тут не ўсядзіць
Ці на мышэй зірне закоса.
Хай трон з гразі — ды ўсё-ткі трон.
Ты мару песціш пра карону.
Сядзіш, палохаеш варон,
Сама падобна на варону.

**Карыта**

Усё нявечна ў свеце гэтым,
І толькі бруднае карыта
Усё ніяк не кане ў Лету,
Хаця й смярдзіць даўно нябытам.

А ля карыта птушак многа,
І кожная пяе адкрыта,
Што ёй бліжэй за ўсіх да Бога,
Што балявацьёй ля карыта.

Да белых чыстых галубіцаў
Падходзяць ястрабы з апекай.
Прадацца мусіш, недарэка,
Каб да карыта як прабіцца.

І прабіваюцца памалу,
І не зважаюць нат на тое,
Што ўжо гнільм карыта стала
І што яно даўно пустое.

**Казка пра вераб’я**

Ён славіў многае і многа,
Бо так лягчэй было карміцца.
Яго пахвальвалі, малога,
Усе, хто толькі не ляніўца.

Малы, а да ўсяго шчэ шэры.
Цяпер такіх не паважаюць.
Дарэмна стукаецца ў дзверы,
Сягоння шэрых не пускаюць.

І ён на сметніцы лятае,
Але і там — такое ж шчасце.
— Сябе шукай!
І ён шукае
Чаго няма, чаго не страціў...

Ён славіў многае і многа,
Бо так лягчэй было карміцца.
Цяпер жа дзюбаюць малога
Усе, хто толькі не ляніўца.

## ПАКУЛЬ ГАРЫЦЬ СВЕЧКА...

### Партрэт

і трэснула неба
і пацякла на зямлю цемра
і заплакалі дзеці
і заспявалі Гады
а мой сусед схаваўся ў скляпенне
я прасіўся да яго але ён мяне не пусціў
сказаў: ты і так не падохнеш
і распаліў я касцёр
і пачаў клікаць людзей
але ніхто не прыйшоў
толькі збегліся Гады
і чакаюць калі патухне агонь
і кончыліся дровы
і спаліў я ўсё што гарэла
і толькі пакінуў партрэт маці
а з неба цячэ і цячэ цемра
а Гады стаяць і чакаюць
з іх чорных языкоў цячэ атрута
і расцякаецца па зямлі і па небе
і страшна загінуць ад Гадаў
і страшна згарэць у агні
і сказала мне маці з партрэта
аддай мяне агню і ты застанешся
і патух касцёр
і мяне разарвалі Гады
і маці сышла з партрэта
і пачалося жыццё

### Вежа

іду па рыпучай лесвіцы
у бела-бялюткай вежы
наперадзе ў мяне цені
і ззаду ў мяне цені
паветра ў вежы як вада

у старым забытым калодзежы
пахне зямлёй і смерцю
з кожным крокам я ўсё вышэй
над сваім былым
над самім сабой
у вокнах іржавыя краты
на кратах крыўская Пагоня
а я ўсё вышэй і вышэй
іду па рыпучай лесвіцы
а ў вокнах іржавыя краты
а на кратах крыўская Пагоня
я чую як лятуць стрэлы
я чую як звіняць мячы
я чую за сабой крокі
і ёсць каму бараніць вежу
і ёсць за што бараніць
але на вежы няма сцяга

* * *

губляюцца словы як залатоўкі
і людзі паміраюць як казкі
на забытых сцежках вырастаюць дрэвы
на дрэвах селюцца птахі
што спяваюць бясконцыя песні
бясконцыя як чорная вечнасць
у якой жывуць людскія душы
я заходжу ў хаты дзе жывуць старыя
і я збіраю ў чырвоны нататнік словы
але словы ўсё роўна губляюцца
і паміраюць людзі
і на забытых сцежках вырастаюць дрэвы
дрэвы з якіх не будаваць Храмаў

**Кніга**

на раздарожжы знайшоў Кнігу
хацеў разгарнуць каб пачытаць
як пачуўся голас ты яшчэ малады
каб чытаць гэтую Кнігу

і я прынёс Кнігу дамоў
занавесіў вокны замкнуўся
і толькі ўзяўся за Кнігу
як пачуўся голас ты ўжо стары
каб чытаць гэтую Кнігу
і я схаваў Кнігу ў шуфляду
і пачаліся ў мяне непрыемнасці
то забудуся сваё імя
то забудуся сваёй годнасці
а то наогул адчую сябе
самым вялікім і разумным
і тады я вырашыў спаліць Кнігу
кінуў яе ў печ і патух агонь у печы
кінуў Кнігу ў возера і высахла вада
і панёс Кнігу на раздарожжа
і паклаў там дзе ўзяў і пакланіўся
на чатыры бакі
і разгарнулася Кніга
і паказала маё мінулае
і паказала маё будучае
і загарэўся агонь у печы
і вярнулася вада ў возера
і мне захацелася вярнуцца
і не было мне дарогі ні назад ні наперад
..............................................
і ляцела ў небе Кніга
і не было ад яе ценю

**Камень**

а з неба ўпаў камень
і сабраліся ля яго людзі
адзін чалавек сказаў
гэта ўпаў метэарыт
другі пачаў даказваць
гэты камень прыносіць шчасце
а трэці пачаў пужаць
гэта пачатак канца свету
і раздзяліліся людзі
на тры крыклівыя натоўпы

і я трапіў у натоўп
дзе даказваюць што камень —
метэарыт
але хочацца мне быць шчаслівым
але хочацца ўратавацца ад канца свету
і я хачу пакінуць свой натоўп
але мяне не пускаюць
і я праклінаю камень
за тое што ён упаў з неба
і я праклінаю свой натоўп
які не хоча шчасця
які не хоча ўратавацца ад смерці
які не пускае мяне
за тое што я паверыў яму
за тое што я проста трапіў у яго
і я іду ў гэтым натоўпе
і я губляюся ў гэтым натоўпе
і я знікаю ў гэтым натоўпе

**Каваль**

на краю вёскі жыве каваль
і яго ў вёсцы не любяць
каваль рана ўстае і позна кладзецца
першы сустракае вандроўнікаў
і апошні развітваецца
цэлы дзень грыміць у кузні
што ён там куе ніхто ніколі не бачыў
адны гавораць куе сякеру
каб ссячы дуб ля дарогі
на якім вісіць скрыня
а ў скрыні ляжаць ключы
ад дзвярэй за якімі шчасце
другія гавораць куе плуг
якім можна ўзараць камень і пасеяць долю
трэція гавораць куе грошы
за якія можна купіць усё нават тое чаго няма
але ніхто дакладна не ведае што куе каваль
і людзі падыходзяць да кузні
прыглядаюцца прыслухоўваюцца

адны хочуць пасябраваць з кавалём
другія хочуць звесці каваля са свету
а ля дарогі расце дуб
а на камянях расце нядоля
і няма ў людзей грошай і няма ў каваля жонкі

## Калодзеж

які ўжо дзень капаю калодзеж
хто ні ідзе — кожны спытаецца
што гэта я надумаў
ці наогул смяецца як з дурня
а я капаю я ўпарты
а вады няма як і не было
аднойчы знаходжу вялізарны куфар
знаходзяцца і памагатыя
кожны раіць як адчыніць куфар
як падзяліць знойдзены скарб
кожны хваліць мяне
але прыходзіць чалавек
які называе сябе Гаспадаром
і забірае ў нас куфар
а мы стаім як авечкі
і глядзім на Гаспадара
яму ўсё дазволена яму ўсё належыць
і я застаюся ізноў адзін
і кожны хто ідзе дзівіцца з мяне
ці наогул смяецца як з дурня
а я капаю
магчыма сваю магілу

## Торба

кацілася торба
адкуль яна кацілася і што ў ёй
ніхто не ведаў адно ведалі ўсе —
у торбы няма гаспадара
і чужое нельга чапаць
нават валацугі і зладзеі

абыходзілі торбу беражонага Бог беражэ
ды ўсё-ткі знайшоўся смяльчак
які заявіў што гэта яго торба
а чым дакажаш што твая
цыраваная чорнымі ніткамі
якія ўчора купіў у краме
не гэтага мала для доказу
завязана белай тасёмкай
якую ўчора дала Тэкля
гэтага таксама мала
і пачаўся такі вэрхал
што чарцям у балоце стала моташна
і забыліся людзі пра свае хаты
і забыліся людзі што яны людзі
і дзень перамешаўся з ноччу
і боб перамяшаўся з гарохам
і на полі вырасла лебяда
і закацілася торба невядома куды
а торба была пустая

* * *

і прыйшоў Ён і сказаў Ён
ратуйце сябе і сваіх дзяцей
дзяцей дзяцей дзяцей
і кінуліся людзі да сваіх куфэркаў
да куфэркаў да куфэркаў
а куфэркі пустыя пустыя пустыя
і кінуліся людзі да панчох з грашыма
а яны пустыя пустыя пустыя
і кінуліся хапаць што трапіць у рукі
што трапіць у рукі што трапіць у рукі
і што ні схопяць з рук выпадае
выпадае выпадае выпадае
і прыйшоў Ён і сказаў Ён
супакойцеся супакойцеся супакойцеся
і яны распялі яго яшчэ раз
яшчэ раз яшчэ раз яшчэ раз
яшчэ многа многа многа разоў
і не плакалі дзеці

* * *

жыву сярод камянёў
якія могуць быць сцяной
якія могуць быць жорнамі
якія могуць быць помнікамі
у кожнага каменя свой лёс
які зараз залежыць ад мяне
магу збудаваць дом
але баюся атрымаецца турма
магу зрабіць жорны
але няма чаго малоць
магу паставіць сабе помнік
але я не двойчы герой
і я жыву сярод камянёў
і я залежу ад камянёў
як тапелец-самагубца
залежыць ад каменя
які ў яго на шыі

## Людзі і манекены

сярод людзей затлумленных будаўніцтам
светлай будучыні якая як далягляд
заўсёды толькі наперадзе
па горадзе бадзяюцца манекены
яны не ведаюць хто яны
але нягледзячы на гэта
яны ведаюць свае правы
есці спаць гуляць есці спаць
і яны збіраюцца ў барах кавярнях
нібыта дома на кухні
а людзі збіраюцца на заводах
а людзі збіраюцца на будоўлях
а людзі збіраюцца на хаўтурах
яшчэ могуць збірацца на пляцах
але толькі тады калі дазволена
з раніцы да вечара з вечара да раніцы
па горадзе бадзяюцца манекены
з раніцы да вечара з вечара да раніцы
працуюць людзі

* * *

ніколі да мяне ніхто не заходзіў
і я жыў без гора-бяды
хаця і шчасця не меў
але была свая хата
і калі я па сваёй дурноце
аб’явіў Бог яго ведае каму
што ў мяне ўсё ёсць
да мяне зайшла жанчына
хто ты? запытаўся я
тваё гора і я павінна
часта заходзіць да цябе
адказала гора і села за стол
следам зайшла другая жанчына
хто ты? запытаўся я
тваё шчасце і я павінна
хоць зрэдку заходзіць да цябе
адказала шчасце і стала ля парога
гасцей патрэбна частаваць
па-гаспадарску сказала гора
не турбуйцеся я зараз пайду
па-сіроцку сказала шчасце
а я разгубіўся і пачаў гаварыць
што я такі адзінокі і бедны
што такога другога нідзе няма
і я вельмі рады гасцям
і зараз іх пачастую гарбатай
але гарбату выпіла Смага
хацеў прынесці слоічак трускавак
але варэнне з’еў Голад
зазірнуў у каструлі — пуста
зазірнуў у халадзільнік — пуста
і пакуль я шукаў прысмакі
госці мае пакінулі мяне
ну і слава Богу
абрадаваўся я і ўздыхнуў
але хутка зноў зайшла жанчына
і калі яна села за стол
я адразу пазнаў яе
і ўсё пачалося спачатку
але толькі ўжо без шчасця

і стаў я праганяць гора
а гора не ідзе
і дастаў з дзіравай панчохі
апошнія рублі і даў гору
грошы гора ўзяло але не пайшло ад мяне
тады я сам уцёк з хаты
замкнуў гора і падпаліў
і вось цяпер блукаю па свеце
і дзе ні жыву — я ўсюды госць
і што ні раблю — раблю для ўсіх
і ні для кога
і куды ні пагляджу — гарыць мая хат
гарыць мая хата

* * *

бясконцы як вечнасць дождж
змывае з майго акна
жоўты і кволы ліст
на клёне сядзіць воран
мокры як ануча
няспешна дзяўбе скарынку
крошкі сыплюцца на зямлю
дзе мокры аблезлы сабака
іх збірае слінявай пысай
мне хочацца крычаць
каб напалохаць ворана
але я маўчу як нямы
і няма каму прагнаць ворана
і няма каму даць мне мову
і толькі бясконцы дождж
змывае з майго акна
жоўты і кволы ліст

* * *

прысніўся сон
мяне распялі
але я не ўваскрос
і не падняўся ў неба
а мёртвы зваліўся з крыжа

на мёртвую засмечаную зямлю
і рассыпаўся на гарох
гарох прарос і выраслі асіны
з чырвоным лісцем
як з Іудавымі языкамі
і на самай вялікай асіне
самая чорная птаха звіла гняздо
самая вялікая гарошына
закацілася ў цень гнязда
і прарасла і вырасла дрэва
з вялікімі спакуснымі пладамі
і з'явіўся чалавек
і з'явілася жанчына
і з'явіўся змей
але я больш не нарадзіўся

* * *

размываюцца сцежкі магілы
на драўляных крыжах змываюцца імёны
ля царквы сядзіць бязногі стары
просіць міласціну

я загадзя дастаю капейкі
трымаю ў потным кулаку
стары з надзеяй глядзіць на мяне
а я на старога
................................
не магу заснуць
з цемры бязногі стары
глядзіць на мяне і кажа
дай жа табе Бог

* * *

зямля ў смецці дамы ў смецці
і магілы шаноўных грамадзян
таксама засыпаны смеццем
і я таксама ў смецці
і невядома дзе дзень
і невядома дзе ноч

і няма ў каго спытаць
і толькі звар’яцелы вецер
нібы ў вялікую дудку
дзьме ў перасохлы калодзеж

* * *

чорныя чорныя чорныя птушкі
белыя белыя белыя косці
чырвоная чырвоная чырвоная вада
чарапы чарапы чарапы
вецер вецер вецер
пыл чырвоны чырвоны чырвоны
адзічэлы конь ідзе да вады
сытыя ваўкі на яго не глядзяць
на яго не глядзяць на яго не глядзяць
галодны абадраны манах
ідзе і глядзіць у неба
і не бачыць чорных чорных чорных птушак
ён бачыць Бога
адзічэлы конь п’е ваду
і не бачыць што вада чырвоная
вада чырвоная вада чырвоная
і ў чэрапе князя і ў чэрапе князя
звіў жаўрук гняздо гняздо гняздо
і ў чэрапе здрадніка і ў чэрапе здрадніка
пасялілася жаба пасялілася жаба
і толькі ў чэрапе воя пуста
Пуста Пуста Пуста Пуста Пуста

**Пакуль гарыць свечка**

па белых і чорных ступенях
сыходжу ў Той Свет
трымаю ў руцэ свечку
як надзею на светлую будучыню
за мной ідзе мой цень
за мной ідзе мой страх
а людзі за мной не ідуць
у кожнага свая дарога ў Той Свет

наперадзе жудасная цемра
за мной жудаснае святло
а я іду і трымаю ў руцэ свечку
і пакуль гарыць свечка
я буду жыць
і пакуль гарыць свечка
будзе ісці мой цень маё былое
якія не пускаюць мяне назад
назад дзе жудаснае святло
назад дзе засталіся людзі
…………………………
і пакуль гарыць свечка
сыходжу ў Той Свет

* * *

і цемра як чорная багна
чорнай крыві і сажы
і дрэвы імкнуцца да зор
нібы да ратунку сляпыя

за ветрам ганяецца ведзьма
а кот не ловіць мышэй
і пуста ў полі і ў куфры
і коміны выюць на ветах

вандроўнік ля вогнішча кленчыць
ён ведае попел адзіноты
а цемра як чорная багна
а дрэвы імкнуцца да зор

* * *

у рыб выраслі крылы
і яны паляцелі
шукаць жывую ваду
прыляцелі ў адну вёску
жывой вады не знайшлі
паляцелі ў другую
і там жывой вады няма
разляцеліся па ўсім Краі…

і лётаюць рыбы ў дымным небе
страсаючы з аблок сажу
і няма ім прытулку
ні ў небе ні на зямлі
а мы глядзім у неба
і дзівімся:
што гэта там за птушкі

**Жаба**

у балоце жыве жаба
яна зачараваная царэўна
але жаба пра гэта не ведае
дакладней ведала але забылася
і гэта ўсё з тае прычыны
што няма на свеце царэвіча
які б выстраліў з лука
і страла б упала ў балота
і сядзіць жаба на купіне
і глядзіць у неба на хмары
і ходзіць па зямлі хлопец
у жылах якога кроў царэвіча
але ён пра гэта не ведае
ён закончыў сярэднюю школу
і цяпер працуе на трактары
любіць выпіць і марыць
асушыць і ўзараць балота
і няма ў яго нявесты
і няма ў яго лука
і не любіць ён жаб
якія начамі квакаюць
і не даюць яму спаць
і сядзіць жаба на купіне
і не бачыць сваёй кароны

* * *

перад вялікімі святамі
з фрэскі што ў закінутай царкве
сыходзіць сам пан Бог

ён прыбірае ля царквы смецце
о які гэта не божы занятак
але што зробіш калі людзі
занятыя самі сабой
здымае павуцінне са сцен
мые каменную падлогу царквы
о які гэта не божы занятак
запальвае свечкі
становіцца на калені моліцца
моліцца слядам чалавечым
якіх ніколі і нічым не змыць
і слухаюць сцены голас Бога
і спяваюць анёлы і плача д’ябал
а людзі праходзяць ля царквы
не здымаючы шапак і не чуюць голас Бога
і не чуюць самі сябе
і я таксама такі як усе
глухі сляпы нямы
і няма ў мяне царквы
і няма ў мяне Бога
і няма ў мяне вялікіх свят

* * *

запрашаю ў госці сяброў
але ніхто не прыходзіць
запрашаю ў госці знаёмых
тыя дзякуюць але таксама
не вельмі спяшаюцца ісці
клічу першага сустрэчнага
а ён глядзіць на мяне як на вар’ята
мо і сапраўды я звар’яцеў
пытаюся сам у сябе
і не магу знайсці адказу
і не магу знайсці хвіліны
зазірнуць у люстэрка
у якім жыве мой двайнік
які таксама нікуды не ходзіць
ён як і я вельмі заняты
сваёй нікчэмнай асобай
якая калі чаго і вартая

толькі вялікага жалю
але няма каму нас пашкадаваць
як няма каму і лаяць
і сядзім мы ўсе па сваіх спратах
і думаем што мы самыя шчаслівыя
і думаем што мы самыя няшчасныя
і запрашаем у госці сяброў
і запрашаем у госці першых сустрэчных
і ніхто да нас так не спяшаецца
як гады хваробы смерць

**На сметні**

па сметні ходзяць вароны
бяздомныя каты сабакі
усе шукаюць паесці
а на сметні хапае ўсяго
нават хлеба мяса солі
часта прыязджаюць людзі
з вялікімі смярдзючымі мяхамі
з якіх выкідаюць тое
што сытым непатрэбна
але самі падоўгу капаюцца ў смецці
топчуцца па хлебе мясе солі
вароны глядзяць на людзей
і пералятаючы злосна каркаюць
а людзі не глядзяць на іх
бяздомных катоў людзі не цікавяць
адно што сярод сабак
знаходзяцца лісліўцы
але людзі адганяюць іх
і злуюцца вароны каты сабакі
адно што суцяшае іх
тое што людзі сытыя

**Плот**

стаўлю плот вакол сядзібы
не таму што хачу адгарадзіцца

хачу каб усё было як у людзей
але амаль кожны хто праходзіць побач
глядзіць на мяне як на ворага
ці смяецца з маёй работы
ці разносіць плёткі па ўсім наваколлі
ці скардзіцца на мяне мясцовым уладам
і я не вытрымоўваю такога іспыту
ламаю новы прыгожы плот
але амаль кожны хто праходзіць побач
глядзіць на мяне як на ворага
ці смяецца з маёй работы
ці разносіць плёткі па ўсім наваколлі
ці скардзіцца на мяне мясцовым уладам

* * *

ля царквы старая прадае Біблію
нацельныя крыжыкі
адны падходзяць разглядаюць
пытаюць колькі што каштуе
але нічога не купляюць
другія падходзяць разглядаюць
выбіраюць іконкі крыжыкі
няспешна дастаюць грошы купляюць
нібы хочуць паказаць што яны вераць
і пакуль яны купляюць
гэта павінен заўважыць сам Бог
і ацаніць гэты ўчынак
і адпусціць хаця б адзін грэх
трэція пытаюць пра Біблію
бяруць яе ў рукі гартаюць
быццам шукаюць сваё шчасце
якое недзе ляжыць паміж старонак
вяртаюць назад — вельмі дарага
і ён таксама хоча купіць Біблію
і ў яго на гэта хапае грошай
але старая яму яе не прадае
і ён крычыць я маю права купляць
усё што мне падабаецца
і яму старая дае крыжык на якім няма распяцця

* * *

Людміле і Веранічцы

стаю пад вокнамі радзільнага дом,
яшчэ не ведаю што нарадзілася
Вераніка
але мне здаецца пра гэта ведаюць
птушкі і аблокі травы і дрэвы
і яны мне гавораць пра гэта
ды я не разумею
я забыўся іхнюю мову
але ж з такімі шчасліўцамі як сам
задзіраю нос пад вокнамі
і пакуль углядаюся услухоўваюся
запіска з добрай весткай ад жонкі
як белы голуб вылятае з акна
і цэлую вечнасць
                                        ляціць
                                                        да мяне

6.4.89.

**Дом**

з таго часу як пачалі будаваць метро
у гэтым доме доўга было ціха
але аднойчы ў трынаццатай кватэры
а магчыма ў дваццаць трэцяй
пасяліўся малады дамавік
я пра яго чуў ад знаёмых
якія магчыма ўсё выдумалі
гэта быў сучасны дамавік
ён зранку піў каву
слухаў жалезны рок будаўнікоў метро
спяваў старыя песні продкаў
святкаваў народныя святы
чытаў уголас беларускія кніжкі
нават «Вячэрні Мінск» на беларускай мове
і невядома колькі б ён так жыў
калі б не з’явіўся чалавек з партфелем
які даведаўся дакладней якому данеслі
пра незаконнае засяленне і пражыванне

пра незаконнае спяванне песень
і чытанне сумніцельнай літаратуры
і ён загадаў выкінуць дамавіка
не толькі з кватэры але і з горада
і выгналі дамавіка
і разбурыўся дом
не ведаю ці праўда гэта ці не
магчыма гэта і казка нефармалаў
але гэта не галоўнае
Няма ДОМА

* * *
вы ўсе сабакі
сказаў з трыбуны чалавек
і яго абсвісталі
сам ты сабака
крычалі самыя гарластыя
сволач ты сволач
стараліся іх падтрымаць другія
а трэція нічога не крычалі
радаваліся смеламу чалавеку
і паглядалі на зачыненыя дзверы
сволачы вы сволачы
сказаў з трыбуны чалавек
і ў зале паўставалі з крэслаў
і на галовах паўставалі валасы
міліцыя міліцыя міліцыя
крычалі самыя гарластыя
у дурдом яго у дурдом у дурдом
стараліся другія
правільна сволачы яны сволачы яны
закрычалі і трэція
а дзед вахцёр стаяў за дзвярыма
курыў і смяяўся бо ён бачыў і не такое
чаго вы смяецеся
запытаўся я
а што плакаць перапытаў вахцёр
і я нічога не мог сказаць
са сцен у калідоры глядзелі партрэты
людзей якіх нас вучылі любіць і мы любілі

а з залы чуліся крыкі
сволачы яны сволачы сволачы сволачы

**Вялікдзень**

у печы растуць булкі
пах расцякаецца па ўсёй хаце
па ўсёй вёсцы па ўсім наваколлі
бабуля абірае шалупінне з цыбулі
каб фарбаваць яйкі
на газавай пліце варыцца кісель
бацька збіраецца ў Ракаў
на ўсяночную ў царкву
маці яму наказвае:
глядзі не напіся па дарозе
а бацька паўтараючы слова добра
складае ў вялікую сумку
хлеб соль яйкі пляшку
у хату забеглася суседка
мужык у яе вялікі начальнік
начальнік вясковага маштабу
і ім нельга хадзіць у царкву
і ім нельга святкаваць Вялікдзень
суседка прынесла хлеб соль яйкі пляшку
просіць каб пасвянцілі і ёй
а на вуліцы чуецца песня
ідуць хлопцы-валачобнікі
сёння яшчэ ж нельга хадзіць
дзіва што няма дабра
а бабуля абірае цыбулю
і плача
і я хачу запытаць яе
чаго яна плача
але баюся
заўтра Вялікдзень і я не ведаю
што мне можна рабіць
а што нельга

**Навальніца**

ці маланка ці трэшчына ў небе
асвяціла страх у душы
і мой позірк перабег да абразоў
з надзеяй урятаваць маё цела
ударыў пярун зазвінелі шыбы
у хаце цёмна і ціха
дома няма маці
бацька ляжыць на ложку
спінай да акна і курыць
мне дзесяць гадоў і мне хочацца жыць
у школе вучаць што Бога няма
і мне страшна што Бога няма
грыміць гром і бацька гаворыць
гэта Бог коціць новыя бочкі з вадой
і я зноў гляджу на абразы
але бачу маці
мне дзесяць гадоў і мне хочацца жыць

**У падвале**

у падвале цёмна і вільготна
у падвале душна і страшна
у сетцы трымаю слоік з капустай
запальваю сярнічку і бачу
сцены
дзверы
замкі
сцены
дзверы
замкі
на шэрых дзвярах чорнай фарбай
напісаны нумары
ад святла разбягаюцца павукі
павукі павукі павукі павукі
па сваіх чорных шчылінах
на іржавай тоўстай трубе
вісіць спарахнелая анучa
сярнічка гасне і ўсё знікае

але застаецца страх
але застаецца вільгаць духата
і я палю новую сярнічку
і шукаю свае шэрыя дзверы
з чорным нумарам вялікім замком
у сетцы трымаю слоік з капустай
і ўсё больш адчуваю сябе павуком
які цягне здабычу ў гняздо
сярнічка гасне і ўсё знікае
і слоік у маіх руках
як цяжкі камень
цягне мяне на дно цемры
дзе ёсць дзверы з маім нумарам

* * *

БОГ
Анёлы Анёлы Анёлы Анёлы Анёлы
бела бела бела бела бела
чырвона чырвона чырвона чырвона чырвон
белы белы белы белы белы
людзі людзі людзі людзі людзі
БЕЛАРУСЬ
храмы храмы храмы храмы храмы
ХРАМ
храмы храмы храмы храмы храмы
дарогі дарогі дарогі дарогі дарогі
людзі людзі людзі людзі людзі
іуды іуды іуды іуды
рай пекла

**Без знакаў прыпынку**

праз поле праз неба праз вечнасць
дарога дарога дарога дарога
без знакаў прыпынку без знакаў без знакаў
на дарозе каменне ператвараецца ў пыл
і я ператвараюся ў пыл
а пыл ператвараецца ў каменне
каменне каменне каменне

каменне збіраюць збіраюць збіраюць
адны робяць брукаванку
другія брукаванку хаваюць пад асфальт
і ставяць знакі знакі знакі знакі
…………………………………………..
праз поле праз неба праз вечнасць
дарога дарога дарога дарога
без знакаў прыпынку без знакаў без знакаў

**Пасля свята**

у чорных вулках шукае ратунку
ад маўклівай як камень самоты
але куды ні пасунецца
усюды натыкаецца на самоту
якая хапае за душу
і цягне з цемры ў кавярню
куды яго не пускаюць
ён босы і стрыжаны
людзі глядзяць на яго
хто са шкадаваннем
хто з непрыхаванай агідай
а хто наогул плюецца
і ён стараецца схавацца
і ад самоты і ад людзей
але куды ні паткнецца
усюды самота і людзі
усюды плакаты і смецце

**Святло свечкі**

які ўжо раз хаджу па старых могілках
няспешна чытаю надпісы на помніках
углядаюся ў здымкі нябожчыкаў
старыя як гэты свет дрэвы
стаяць ля магіл як вінаватыя
у пахілай каплічцы святло свечкі
яно трапеча яно жыве
кожная магіла абгароджана

ля кожнай магілы лаўка
дзе можна пабыць сам-насам
са сваім мінулым і будучым
хачу зайсці — варотцы завязаны
на царкве таксама замок
на іржавым крыжы чорны воран
ён уважліва глядзіць на мяне
ён тут гаспадар а я госць
ля каплічкі на каленях жанчына
яна моліцца яна не бачыць мяне
я не малюся бо не ўмею
іду далей чытаю надпісы
углядаюся ў твары памерлых
яны ўглядаюцца ў мяне
а святло свечкі трапеча
а святло свечкі трапеча

**Два вершы**

у вянок бабулі Ганне

I

я помню бабуліны казкі
я помню бабуліны песні
я быў малы і непаслухмяны
паліў кастры на ганку
верыў у добры агонь
хадзіў па лугах і палях
размаўляў з птушкамі
хадзіў да ручая ў лес
размаўляў з вадой і дрэвамі
гэтаму мяне навучыла бабуля
за агонь на ганку мяне лаялі
з размоў з птушкамі вадой і дрэвамі
мае аднагодкі смяяліся
але я верыў у лепшае
гэтаму мяне навучыла бабуля
і ходзячы па белым свеце
я спяваў і плакаў
я сумаваў і смяяўся
і колькі б я ні хадзіў
я заўсёды вяртаўся дахаты

гэтаму мяне навучыла бабуля
і сёння калі я не магу
пагаварыць з ёй пра жыццё
я размаўляю з агнём і птушкамі
з вадой і дрэвамі
я чую бабуліны казкі
я чую бабуліны песні
я чую бабуліны крокі
і нельга мне быць малым
і нельга мне быць вялікім

II
стаю ля свежавыкапанага дола
сярод кветак і сваякоў
гляджу на той свет
у які адплывае бабуля
у руцэ трымаю свечку
асвятляю былое і будучае
асвятляю гэты і той свет
поп чытае малітву
напамінае пра тое што мы ўсе тут часова
мы ўсе павінны вярнуцца дамоў
жанчыны моляцца і плачуць
мужчыны і дзеці маўчаць
трапечуць агеньчыкі свечак
на нас глядзіць і дыхае неба
і не страшна памерці
і не страшна жыць
глядзім на той свет
у які адплывае бабуля
а мы стаім на беразе

**На дварэ**

на дварэ цёмна-цёмна
з дамоў праз вокны цячэ святло
да яго спяшаюцца людзі
як на агонь матылі
з поўнымі сеткамі — жанчыны
з пустымі рукамі — мужчыны

на балконе стаіць стары
ён як Бог які нічога не можа
у альтанцы галосіць гітара
смех жарты віскат лаянка смех
кожны абыходзіць альтанку
як абыходзіў бы нячыстую сілу
у пад’ездзе мясцовыя п’яніцы
спрачаюцца ў каго лепшая самагонка
а на дварэ цёмна-цёмна
з дамоў праз вокны цячэ святло
і да яго спяшаюцца людзі
як на агонь — матылі

* * *

і разлілося чырвонае чырвонае віно
па белым па белым па белым абрусе
і рассыпаліся па цэментавай падлозе
медзякі медзякі медзякі медзякі
калі ўстаў ён і сказаў
даволі даволі да волі да волі
і выйшаў ён са скляпення
і не ўбачыў у небе сонца
а толькі чорную чорную чорную прорву
і крыкнуў ён людзі людзі людзі
і ніхто яго не пачуў
і вярнуўся ён назад
але за яго сталом сядзелі
чэрці чэрці чэрці чэрці
і гулялі ў карты карты карты карты
і пілі яго чырвонае чырвонае віно
і белы абрус стаў чорным чорным
як жыццё і смерць як жыццё і смерць

* * *

і нічога мы не баімся
і ніхто нас не баіцца
і сядзіць чорт на покуце
гоніш яго чапялой
а ён смяецца і кідае капейкі

сагнешся а ён ужо і на карку
і так ходзіш сагнуты
але пра сваё гора не крычыш
спадзяешся што ўсё бачыць Бог
усё аплаціцца тройчы
і ніхто нічога не бачыць
і ніхто нічога не чуе
і пытаецца чалавек у сябе
калі ўсё гэта скончыцца
і спадзяецца што пачуе
сам пан Бог
але ніхто нічога не бачыць
ні на зямлі ні на небе
і ніхто нічога не чуе
на карку сядзіць чорт
і сыпле пад ногі капейкі

* * *

у мае вокны глядзіць суседні дом
ён даўно прададзены на дровы
новы гаспадар зрэдку прыязджае
падчас нават і начуе ў купленым доме
але начуе толькі тады
калі з ім прыязджае жанчына
жанчыны прыязджаюць розныя
адны патрабуюць каб мужчына перапрадаў дом
і купіў апошняй маркі машыну
другія патрабуюць перавезці дом за горад
і зрабіць шыкоўную дачу
трэція патрабуюць зрабіць у доме рамонт
і здаваць яго частку кватарантам
мужчына з усімі згаджаецца
але нічога не робіць
у яго ёсць машына дача кватэра грошы
у яго хапае прыгожых жанчын
якія не хочуць быць гаспадынямі
у старым доме купленым на дровы
у мае вокны глядзіць прададзены дом

**Могілкі**

крыжы крыжы крыжы крыжы
камяні камяні камяні
пад імі косці косці косці косці
беларусаў палякаў яўрэяў рускіх беларусаў
беларусаў беларусаў беларусаў беларусаў
чарнее чарнее чарнее
сярод могілак цень Іуды
Іуды Іуды Іуды Іуды
святлее святлее святлее
сярод могілак цень Хрыста
Хрыста Хрыста Хрыста Хрыста
і гарацъ на магілах свечкі
свечкі свечкі свечкі свечкі
Іуда хаваецца ў цемру цемру цемру
Хрыстос ідзе да святла святла святла
і паміж імі косці косці косці
беларусаў палякаў яўрэяў рускіх беларусаў
беларусаў беларусаў беларусаў беларусаў

**Цягнік**

у нашым купэ цесна і душна
моўчкі і няспешна пѐм гарбату
стараемся паказаць сваю інтэлігентнасць
падаём цукар пячэнне дзякуем
прапануем сёе-тое што ўзялі ў дарогу
адмаўляемся дзякуем прапануем
ва ўсмешлівых масках цікаўнасці
глядзім праз бруднае акно
на сумныя нецікавыя краявіды
пачынаем пра надвор'е канчаем палітыкай
праваднiца збірае шклянкі
звінім капейкамі дзякуем
адкуль у нас такая выхаванасць
паціху пачынаем знаёміцца
жартаваць расказваць анекдоты
скардзіцца на тое
што нідзе нічога няма

усё амаль жа так і ў суседнім купэ
усё амаль жа так і ў суседнім вагоне
усё амаль жа так і ва ўсім цягніку
які як тэатр на колах
дзе разыгрываецца адзін і той жа
кепскі і доўгі як дарога спектакль
пад шаблоннай назвай «Мінск — Масква»

**Яны і мы**

ім нельга збірацца на пляцах
і яны збіраюцца ў скляпеннях
яны былі прыгожымі і маладымі
ім прарочылі светлае будучае
ім абяцалі малочныя рэкі
і залатыя горы
яны лічаць што іх падманулі
бо ім далі адукацыю
якая нікому ў свеце непатрэбна
далі волю і далі грошы
якія нічога не даюць
мы не любім іх
бо яны жывуць не так як мы
бо ў нас нічога няма акрамя абавязкаў
але мы лепшыя за іх бо мы іх асуджаем
бо мы змагаемся з бюракратамі
і мы прызнаём некаторыя дзяржаўныя законы
нам можна збірацца на пляцах
калі нам дазволяць
ім нельга збірацца на пляцах
і яны збіраюцца ў скляпеннях
і ў Краі хапае разумных
якія ставяць знак роўнасці
паміж імі і намі

**Сцены**

сцены сцены сцены сцены
муха б’ецца б’ецца б’ецца ў шыбу

капае капае капае з крана вада
плыве цыгарэтны дым дым дым
а чалавек чытае газету
чытае чытае чытае
галодны павук пляце павуціну
пляце павуціну пляце павуціну
на сцяне трэшчына чорная чорная чорная
а чалавек чытае газету газету газету
а павук злавіў муху і душыць яе
і душыць яе і душыць
а з трэшчыны сыплецца пыл
а з крана капае чырвоная вада
чырвоная вада чырвоная вада
а на сцяне трэшчына чорная чорная чорная

**Камяні**

і прыйшоў час збіраць камяні
усе адчулі ў гэтым патрэбу
адчуў і малады чалавек
ён купіў білет на электрычку
сеў у брудны як гэты свет вагон
выйшаў на бяздушным як гэта жыццё прыпынку
знайшоў поле камянёў
і пачаў збіраць камяні
збіраў дзень збіраў два
а на трэці дзень убачыў
што такі ж малады чалавек
не зважаючы на яго збірае таксама камяні
што ты робіш гэта маё поле
гэта мае камяні
закрычаў ён але і той не змаўчаў
гэта маё поле гэта мае камяні
доўга сварыліся пакуль надумаліся
раздзяліць поле раздзяліць камяні
і кожны стараўся падмануць
і кожны стараўся паказаць сілу
і кожны стараўся абразіць
……………………………….
і прыйшоў час раскідаць камяні

* * *

са снегу зляпіў чалавека
вучу яго хадзіць і размаўляць
а ён разгублена глядзіць на мяне
вуголлем сваіх вачэй
ён не разумее што я хачу
я злуюся і ляплю другога чалавека
вучу яго хадзіць і размаўляць
але нічога ў мяне не атрымоўваецца
я злуюся і пачынаю ўсё спачатку
але нічога ў мяне не атрымоўваецца
і я кідаю пачатую справу
іду да хаты а за мной снежныя чалавекі
яны паўтараюць мае жэсты мае словы
яны злуюцца яны смяюцца
я хачу ўцячы ад іх але не магу
яны даганяюць мяне і снежнымі рукамі
цягнуць мяне на вуліцу
я крычу але мяне ніхто не чуе
і толькі снежныя чалавекі
і толькі снежныя чалавекі
і толькі снежныя чалавекі
глядзяць на мяне вуголлем сваіх вачэй
вуголлем вачэй вуголлем вачэй

**Ялінкі**

у ляску ля роднай хаты
растуць дзве ялінкі
аднойчы я сустрэўся з імі
пазнаёміўся і пасябраваў
калі мне было сумна
калі мне было весела
і наогул каб пагаманіць
я ішоў да іх
ніхто ніколі
мяне так нё разумеў
як разумелі ялінкі
я пісаў вершы і чытаў ім
давяраў ім свае таямніцы

уцякаў да іх ад сваіх аднагодкаў
цалаваў ім галінкі
як цалуюць рукі паненкам
а пасля пазнаёміў іх
са сваім малодшым братам
але аднойчы я стаў дарослым
стаў такім як усе
і няма ў мяне сяброў
а ёсць у мяне грошы
і няма ў мяне ворагаў
а ёсць у мяне грошы
але пакуль растуць ялінкі
у ляску ля роднай хаты
яшчэ не ўсё страчана
яшчэ не ўсё страчана

* * *

я не веру ў Бога
але баюся яго
я не веру ў Страшны Суд
але баюся яго
я ведаю што я смяротны
і мне ад гэтага страшна
і я нібы агеньчык свечкі
трапячу на ветры вечнасці
я ведаю што мы беларусы
што мы ёсць былі і будзем
што наша мова як наша кроў
не можа знікнуць з нас так
каб мы без яе засталіся жыць
але наша мова знікае
але народ ператвараецца ў насельніцтва
нягледзячы на ўсе пастановы
нягледзячы на наша змаганне за адраджэнне
нягледзячы на нашу любоў
і я не веру ў Бога
але баюся яго

## Паштоўкі

перабіраю старыя паштоўкі
кожная паштоўка начынаецца
дарагі шаноўны паважаны
на кожнай паштоўцы пажаданні
здароўя шчасця поспехаў
ды няма ў мяне здароўя
ды няма ў мяне шчасця
ды няма ў мяне поспехаў
а толькі адны пажоўклыя паштоўкі
якія я магу выкінуць на сметнік
якія я магу спаліць
але я цярпліва берагу іх
нібы дарагія талоны
на здароўе шчасце поспех

## У цемры

спінай да ветру сяджу ля кастра
агонь цярусіць у неба іскры
яны лятуць да спелых зорак
з неба падаюць знічкі
у нашы сляпыя вочы
якія не бачаць былога
якія не бачаць будучыні
знічкі ператвараюцца ў слёзы
слёзы ператвараюцца ў святло
але і гэтага я не бачу
а ў агні скачуць святыя
а ў агні скачуць нячыстыя
ім нельга быць разам
і яны адлятаюць на іскрах
у неба дзе іх чакае смерць
я гэтага не бачу і мне
не страшна сядзець ля кастра
у цэнтры святла і цемры
у цэнтры жыцця і смерці

* * *

мы аддзяляемся адзін ад аднаго
словамі сцэнамі гадамі смерцю
нам цесна ў гэтым свеце
нам адзінока ў гэтым свеце
мы шукаем лепшага жыцця
снег засыпае нашы сляды
дождж размывае нашы сцежкі
вецер разбурае нашы збудаванні
а мы аддзяляемся адзін ад аднаго
баімся страціць сваю нікчэмнасць
баімся залежнасці
і не заўважаем свайго рабства
і не заўважаем сваёй дурноты
мы гінем мы знікаем
паміж намі словы сцэны гады смерць

**На раздарожжы**

яшчэ не позна
вярнуцца на тое раздарожжа
дзе ляжыць камень
з трыма надпісамі:
пойдзеш налева
будзеш шчаслівы
і багаты
пойдзеш направа
будзеш няшчасны
і багаты
пойдзеш прама
будзеш біты
і бедны
яшчэ не позна
вярнуцца на тое раздарожжа
і зрабіць свой надпіс
але я іду і іду наперад
па той дарозе якую я не выбіраў
а дарога вядзе і налева і направа
адначасова наперад і назад
але мне не вярнуцца на тое раздарожжа

са мной ідуць людзі
яны нясуць сваё былое
і сваё будучае
і я перад імі як цень
на нас глядзіць неба
і я не магу вярнуцца
і зрабіць свой надпіс
але…

## БЕЛЫ СВЕТ, ДЗЕ НАМ КАНАЦЬ

* * *

Мая Айчына стала палігонам.
Сказаў і чую крык: — Маўчы, дурны!..
Пра ўсё крычаць дазволена варонам,
Бо птушку не паставіш да сцяны.

* * *

Уладзіміру Караткевічу

Ён быў, ён ёсць, ён вечна будзе,
Як белы свет, дзе нам канаць.
Без мовы быдла мы — не людзі,
І быдлу ў статку існаваць.

Ён выбраў крыж цяжкі і вечны,
Ён выбраў замак назаўжды,
Дзе быць пракорам небяспечна,
Хаця і дома будзеш ты.

У замку плодзяцца бязверцы,
Як пацукі і як клапы.
Там нельга сум насіць у сэрцы,
І можна быць глухім, сляпым.

У замку цэняцца законы,
Якія воран ім прынёс,
Таму й святыя там вароны,
Таму і блудам люд аброс.

У замку панствуюць і дзеляць,
Крадуць, купляюць, прадаюць.
Жанчыны горбяцца ў нядзелю,
Мужчыны лаюцца і п'юць.

Якая святасць там? Смяхоцце.
Святочна хочаш жыць — маўчы.
За маці-праўду — адмалоцяць

Свае ж браты-паслугачы.

Ён не маўчаў, як мы маўчалі,
Ён крыж свой нёс, як стогн, цяжкі.
Ён бачыў нас, ён бачыў далеч,
Дзе Белай Русі жыць вякі.

Ён быў, ён ёсць, ён вечна будзе,
Як белы свет, дзе нам канаць.
Нам замак бараніць свой, людзі,
У замку нельга існаваць.

* * *

Слова «кахаю» — то слабае слова.
Мужнае слова — абараню.
Ларыса Геніюш
Колькі прызнанняў у шчырым каханні,
Цяжка паверыць у шчырасць прамоў.
Покуль гаворым, руйнуе курганні
Той, хто адрокся сваіх каранёў.

Покуль гаворым, руйнуюцца замкі,
Песні ў нябыт адыходзяць з людзьмі.
Часта гаворкі — выгодныя лямкі,—
Раз ухапіўся — цягні ды цягні.

Сёння, як смецце — прызнанні, прамовы,
Імі не спыніш віхуры, агню...
Слова «кахаю» — то слабае слова,
Мужнае слова — абараню.

* * *

Па горадзе ходзяць салдаты,
Па горадзе лётаюць чуткі.
На сценах каростай — плакаты,
Ля бараў — стаяць прастытуткі.

А людзі клянуць магазіны
І болей не вераць уладам.

Хто кажа: «Ратуйце Айчыну» —
Таго аб’яўляюць вар’ятам.

Друкуюцца кнігі і грошы,
І кнігі і грошы — паперы.
З трыбун выступаюць прыгожа
Актыўныя пенсіянеры.

Клянуць нефармалаў, Пагоню,
Нібыта прысуд ім чытаюць.
І Сталіна царску карону,
Як сонца, у марах люляюць,

Каб дзень не здаваўся чарнюткім...
Але, як не служаць плакаты,
Па горадзе лётаюць чуткі,
Па горадзе ходзяць салдаты.

* * *
І лёс захлынуўся крывёю,
І ўсё-такі ўбачыць паспеў:
Высока над вольнай зямлёю
Іуда з пятлёю ляцеў.

**Там**

Там жыццё працякае бязмэтна,
Там на могілках паляць крыжы.
Там жыве прахіндзей несусветны,
Прадае, нібы шчасце, глыжы.
Там не цені паўзуць па дарозе,—
Гэта ў вечнасць сыходзіць народ.
І Харон праз раку перавозіць,
І малітвы пяе ідыёт.
І на беразе людзі галосяць,
Праклінаюць расхвалены Край.
Смерці ў Бога бязбожнікі просяць,
Спадзяюцца патрапіць у рай.
Толькі ў рай не патрапіш ніколі,

Бо яго не было і няма.
Людзі волю шукаюць у полі,
Толькі ў полі — чарнее турма.
Называюць турму родным домам,
Хто знявечыў і дом свой і Храм...
Толькі гэта ўсё Там, толькі Там...
Толькі дзе гэта Там — невядома.

**Партрэт**

Ці то вечнасць, ці то вечар за сцяною
Паўтарае: — Ну які бязбожны свет...
Мой пакой заліты мёртвай цеплынёю,
На сцяне аблезлай, як акно, партрэт.

Сцяг Пагоні крыўскай бачны на партрэце,
Рыцар Караткевіч, наш гаротны лёс...
А з партрэта вее, нібы з неба, вецер,
Аж на спіне ходзіць студзеньскі мароз.

І чуваць з партрэта вольны роў турыны,
Звон падкоў грымотны, лязганне мячоў...
Ёсць каму і сёння бараніць Айчыну,
І Айчына верыць у сваіх сыноў.

А сусед вушасты спаць не можа ночай,
Лае, як прапойцу, кожны дзень мяне.
На партрэт, як зойдзе, злосна косіць вочы
Што пад ім хаваеш, злыдзень, на сцяне?

Я, каб не давесці да труны суседа,
Зняў партрэт са сценкі. На маіх вачах
Хлынула бясконцасць зорнага сусвету,
Змыла сцен турэмнасць і суседаў прах.

* * *

Даўно няма між нас святых,
Святых не ўмеючы іграем.
Храм узарвалі залаты,

Па сёння золата збіраем.

Ахвота панскага жыцця,
Ды ўсе не могуць быць панамі.
Шукаем золата, смяцця
Не бачым нават пад нагамі.

Дваццаты век, ты век калек,
Сусвету дымная дарога.
З каго смяешся, чалавек?
Далёка смех з сябе самога.

І што казаць? Каму казаць?
Усе разумныя сягоння.
Наш лёс — пякучая сляза
Ляжыць у д’ябла на далоні.

А мы будем гарады,
Як быццам рай зямны ствараем.
Даўно між нас няма святых,
Святых, не ўмеючы, іграем.

**Наша восень**

Людміле

Радзей успамінаецца Масква,
Радзей успамінаю інтэрнат.
Ды свеціцца адчайна лістапад,
І праз асфальт расце трава.

Сузор’і зорак, нібы руж кусты,
Для нас журботным дыхаюць святлом.
Як паратунак душ —
сяброўскія лісты,
І Караткевіча бялюткі том.

І прыйдзе дзень, і пойдзем на Маскве,
Па-беларуску будзем размаўляць,
Гадаць, якое воблака плыве
З Айчыны, каб — рукою памахаць.

Забудзецца на хвілю інтэрнат,
Ды пра яго напомніць нам Масква.
Мы пройдзем праз адчайны лістапад,
Дзе праз асфальт расце трава.

**Манекеншчыца**

Амаль што голая ідзеш на сцэну
З усмешкаю прыдатнаю для свят.
І цела, а не вопратку тут цэняць
Мужчыны, што прыходзяць на прагляд.
Яны глядзяць галоднымі вачыма
І ў думках распранаюць дагала.
Саромецца тут нельга, немагчыма,
Калі ты ў манекеншчыцы пайшла.
Для большасці прысутных — прастытутка.
Цябе гатовы зараз жа купіць,
Купіць за келіх каньяку на суткі,
І пераспаць, і, нібы сон, забыць.
І што каму, што плачаш ты начамі
І лёс клянеш над чаем давідна.
Няшчасная з прыгожымі нагамі
Без грошай, без кватэры і адна.
Ідзеш па сцэне быццам бы багіня,
Што мае ўсё, што хочацца душы.
А ты ў палацы мод, нібы рабыня,
Працуй, што мала плоцяць — не кажы.
Сышла са сцэны, быццам з эшафота,
І слёзы ўпотай выцерла з вачэй:
— Праклятая, бязбожная работа!
Якія морды гадкія ў людзей!
Глядзяць на ногі быццам бы вар'яты...
І твар прыгожы пачарнеў ад зла...
Накінуўшы убор, чужы, багаты,
Ты зноў на сцэну ўсмешліва пайшла.

* * *

На гэтым свеце кожны — госць,
І хто як можа, так піруе.

Зямлю ўратуе прыгажосць...
Хто ж прыгажосць саму ўратуе?

* * *

На людным праспекце ля шэрай сцяны
Мастак прадае, невясёлы, карціны.
Людзей не цікавяць карціны,
яны
Бягуць, згаладалыя, у магазіны.

— Ну хопіць, даволі! Пара ўжо змывацца! —
Сказаў і
застаўся на месцы стаяць.
А людзі бягуць і ў вітрыны глядзяцца,
З вітрынаў вар'яцкія маскі глядзяць.

**У час зялёнага дажджу**

— Над горадам лятаюць парасоны...—
Сказаў паэт, і залілося смехам
Усё, што мела вусны і раты.
А Слых сядзеў, як клоп, увесь чырвоны
Ён зразумеў, што тут запахла грэхам,
Што тут пачатак буры і бяды.
Сягоння смех, а заўтра — барыкады,
Падзел зямлі, падзел карыт і славы,
А там, глядзі, і прыйдзе сам Капец.
Ды што рабіць? Не даць натоўпу рады
І хто ім даў паэта слухаць права?
Паэту на вяроўцы час хрыпець...
А дождж ішоў, і быў той дождж зялёны.
Смяяліся разумныя і дурні,
Чытаў паэт, і Слых яго трываў.

— Над горадам лятаюць парасоны,
Над горадам лятаюць прыгажуні,
Над горадам ляціць стары трамвай...

**Ціхае мястэчка**

У ціхім мястэчку ні стайні, ні храма,
У ціхім мястэчку ні д’ябла, ні Бога.
У цэнтры, як сметня, смярдзючая крама,
Ля крамы віецца змяёю дарога.

І выцвілы сцяг, як анучу гнілую,
На краме матляюць вятры-абібокі.
Пад плотам, як дома, п’янчугі начуюць,
І скачуць па плоце, як чэрці, сарокі.

Расце за мяжою культура і жыта,
А ў ціхім мястэчку не вераць у гэта.
І толькі вар’ят гарлапаніць адкрыта:
— Не верце! Не верце савецкім газетам!

Вар’ята забралі, спаліў нехта краму,
Ад страху пятлёй завілася дарога...
У ціхім мястэчку ні стайні, ні храма,
У ціхім мястэчку ні д’ябла, ні Бога.

**Яма**

Вечар, і вецер, і сонца, як рана.
Людзі і цені праз вулку ідуць.
Вулка ўжо столькі гадоў раскапана —
Пэўна, у яме ўжо чэрці жывуць.

Яму паўгода мужчыны капалі,
Трубы шукалі, нібыта той свет.
Плакалі зранку, пад вечар спявалі,
Пахла віном, недаедкам катлет.

Ці адшукалі хоць што — невядома.
Зараз у яму скідаюць смяццё.
Крыкі і музыка побач у доме —
Быццам бы ў яме, у доме жыццё.

Яму хацелі засыпаць жанчыны.

Вы не капалі — не вам засыпаць.
Зранку мужчыны каля магазіна
Сумныя ходзяць, на дзверы глядзяць.

Горад раве і раве несціхана,
Быццам ад выбуху яма дыміць.
Вечар, і вецер, і сонца, як рана,
І разбягаюцца цені з людзьмі.

## Сабака

Здыхаў сабака ды не поўз да Хаты.
У Хаце сытыя яго браты
Крывёю абжыраліся на святы,
Аж да зямлі звісалі жываты.
Ён быў галодны, біты-перабіты,
Ён свой ланцуг парваў і ў поле збег.
І доўга сніў крывавае карыта,
Блатных людзей і іх паганы смех.
Былыя сябрукі бягуць за сучкай,
Забыўшыся на гонар і свой род.
І ён увесь у пыле і калючках
Глядзіць на сучку нібы ідыёт.
Яго душа пакутна пакідае,
Ды слёз не бачна ў ледзь жывых вачах.
Жыццё было як клетка залатая
У д’ябла ў акрываўленых руках.
Брашы мацней, і будзеш, браце, сыты.
Ад сытасці і ён падчас дурнеў,
Хваліў сваё крывавае карыта,
Пакуль аднойчы ўсё ж не зразумеў,
Што ён ніхто, што ён, як раб праклятаы
Сядзіць на ланцугу... Цяпер жа сам
Ён смертнай воляю, як Бог, багаты,
І поле палыну — ягоны Храм.

## Ваўкалака

Чакаеш смерці, ваўкалака,—

Душа-пакутніца баліць.
І сіл няма сябе забіць,
І слёз няма, каб выць і плакаць.
Ты па-вар'яцку закаханы!
І даў жа Бог табе кахаць
Прыгожую, аж страшна, Панну,
З якой іконы маляваць.
Яна й сядзіць, нібы святая.
Маліся ёй, ды не кахай.
І д'ябал па-над ёй лятае,
З сябе крыўляе жаніха.
А колькі ўжо хлапцоў здурэла
І праз яе ў нябыт сышло.
«Каб ты, нячыстая, згарэла!» —
Кляне, нервуецца сяло.
І як табе тут, ваўкалаку,
Як смерць страшному, шчасце знаць!
І ланцугі грызуць сабакі,
Ды ім цябе не разарваць,
Хоць ты гатоў да смерці лютай,
Як да пакут — ля белых ног.
Ты б з рук яе злізаў атруту,
Каб з-за куста хоць выйсці змог.
А д'ябал лётае над ёю
І песню гідкую пяе.
Яго б ты з'еў, змяшаў з гразёю,
Каб ён не лётаў ля яе.
А так стаіш, нібы пабіты,
І Панну поглядам ясі.
Ты сілай, як агнём, наліты,
Ды цела ў поўсці і гразі.
— Дзе ж смерць падзелася дурная?
Ты лапу чорную грызеш.
А Панна пра цябе й не знае,
Не будзе знаць, калі й памрэш.
Чакаеш смерці, ваўкалака,
Цябе ж і смерці — не любіць.
І сіл няма сябе забіць,
І слёз няма, каб выць і плакаць.

**Чалавек-рыба**

Ты рыбай стаў, сучасны беглы раб.
Дзе ты прабег — цяпер зямля гарыць.
Жывеш у багне між агідных жаб,
Якім не разадзьмуцца да царыц.
Без памяці, без радасці, без дум,
Замест душы — паветраны пузыр.
І ўсё жыццё — гнілы балотны сум,
І белы свет — з распустай манастыр.
І цела ўсё пакрытае луской
Свярбіць, гарыць, але табе — маўчаць.
Лілеі белыя даюць спакой,
Ды жабы звар'яцелыя крычаць,
Што ім не трэба цішыня, святло.
Як людзі жыць не могуць без цароў,
Так век яшчэ на свеце не было
Балота без гразі, без камароў.
Твой свет — балота, ты ў балоце — цар,
Цар-рыба з чалавечай галавой.
Твае ўсе мары — муха і камар,
І кроў твая зрабілася гнілой.
Жывеш без Бога — з Богам лішні тлум.
Тваё жыццё, нібы ў скананне пір,
Без памяці, без радасці, без дум,
Замест душы — паветраны пузыр.

* * *

Вяртаюцца паэты з небыцця,
Мы молімся на іхнія імёны
І грошы зарабляем для жыцця.
Шумім, нібы на могілках вароны.
А нам недадзена судзіць багоў,
Хоць пры жыцці раўняемся з багамі.
Якія мы нашчадкі змагароў?
Адно крычым, махаючы рукамі.
І скардзімся, што ўсё ж нялёгка нам
Дабіцца ўсенароднага прызнання...
Паэзіі абрабаваны Храм
Адновіцца Паэзіі вяртаннем.

І непазбежна прыйдзе судны час,
І засмяецца Сфінкс. А нашы твор
Ці скажуць што талковае пра нас?
Былі, жылі і зналі многа гора,
І грошы заграбалі для жыцця,
Без помнікаў баяліся застацца...
Вяртаюцца Паэты з небыцця,
А нам ці суджана чытацца?

* * *

Няма Караткевічаў новых,
Няма і Стральцовых.
І сумна, і крыўдна жывецца
І мы ўсе ці варты граша.
Паэт памірае — душа застаецца.
Заўжды застаецца душа!
Ды дзеліцца слава,
Як доўгая лава.
Нат могілкі дзелім з вянкамі.
А хто раздзяляе?
Хто славы не знае,
А хоча зрадніцца з вякамі.
Найлепшых губляем, бядуем.
Жывых жа не чулі, не чуем,
Што славу прыносяць Айчыне...
А хто нас наступным пакіне?
Няма Караткевічаў новых,
Няма і Стральцовых.

* * *

Памяці Яўгеніі Янішчыц

Паэта губіць геніяльнасць адзіноты,
Бяздарны вецер гасіць свечкі ля ікон.
І смерць нас не пытае: «Чый ты? Хто ты?..»
І самых вольных забірае ў свой налон.

Жывым зайздросцім, бэсцім, носім кветкі—потым.
Нам кветкамі свой грэх павек не адмаліць.

Бязлітасна цалуе лепшых адзінота,
За святасць мы не ўмеем бліжняга любіць.

І вінавацім, грэшныя, абставін збегі...
Патухла ў небе горка, як Твой лёс, святло.
На шлях у вечнасць
Бог насыпаў снегу,
І Беларусь па сэрца зранку замяло.

Спяшаемся, бы раптам зразумелі: хто Ты.
Спазніліся. Запознены, як крык, паклон...
Паэта губіць геніяльнасць адзіноты,
Бяздарны вецер гасіць свечкі ля ікон.
29.11.88

**Помста**

У атрутным тумане курганне,
Чорны прывід на чорным кані
Скача гулка насустрач світанню,
Скача ў смерці сляпыя агні.

Меч блішчыць, як маланка ліхая,
Іскры сыплюцца з-пад капытоў,
І трава абгарае сухая,
А на травах — варожая кроў.

Хіжы моліцца, лоб разбівае:
— Пашкадуй ты мяне, абміні...
Чорны прывід каня не спыняе,
Пралятае па ім на кані.

Разбягаюцца ў ноч свалачугі,
Не знаходзяць ратунку ў начы.
І звініць па-вар'яцку кальчуга,
Кроў сцякае па гострым мячы.

І ў балоты хаваюцца Гады,
І асіны ад жаху дрыжаць.
Толькі ў цемры мужыцкія хаты

Не баяцца нічога і спяць.

У атрутным тумане курганне,
Чорны прывід на чорным кані
Скача гулка насустрач світанню,
Скача ў смерці сляпыя агні.

**Залатая карона змяі**

Жалезны крыж іржа з’ядае
І рушацца вякоў святыні.
Змяі карона залатая
Як сонца ў мёртвае пустыні
Праменіць з чорнае канавы,
Кудой сцякала кроў-вада
Маёй зямлі, стагналі травы,
Спявала песні свалата.

Няма змяі, няма балота,
І толькі вецер смерць-пясок
Мяце, узносіць з асалодай
Да белых, нібы соль, аблок.
Карону вецер залатую
Скрануў і пакаціў у свет.
Лісіцы ў норах лямантуюць,
Бягуць мурашкі па траве.

...Змяі карона залатая
Па Краі коціцца, як гром,
Ды мы не чуем — засядаем,—
Змяю, галодныя, жаром.

* * *

І трэснулі сцены ў кватэрах,
Чарнеюць у трэшчынах краты.
Маўклівыя пенсіянеры
Завылі, нібыта вар’яты.

Заплакалі дзеці ад жаху,

Мужчыны ад суму занылі.
А чэрці гарцуюць на даху —
Іх з пекла на волю пусцілі.

І толькі паэт непрызнаны
На жахі зірнуў, як на будзень,
Сказаў, пляшкі зносячы ў ванну
— Яшчэ, брат, не тое ў нас будзе!

— А што ў нас тут будзе такое?
Скажы, і цябе мы палюбім! —
Завыла ўсё шэра-гнілое:
— Не то як сабаку загубім!

Паэт жа зацішыўся ў ваннай
І выпіў апошнюю пляшку
За вочы сляпыя прызнаных,
За музу — п'яную манашку.

А сцены трашчэлі ў кватэрах,
На вокнах чарнеліся краты.
І ў Бога надумалі верыць—
Хто божай спагады не варты.

**Камуналка**

Хто сказаў: тут жыць мы рады--
Той, напэўна, ідыёт.
Развалюха наша хата.
І такі ж у ёй — народ.

Тут і п'яніца праклятая,
Наркаман тут і вар'ят.
Прастытутка п'е гарбату
І міргае ўсім падрад.

На стале гарой талеркі —
Мухам — проста любата.
Дзве глухіх пенсіянеркі
Вучаць мудрасцям ката.

У чарзе да прыбіральні
Прастаіш не пяць хвілін.
На пліце насаты чайнік
Сіратой стаіць адзін.

Паразвешана бялізна.
Правадоў, як павуты.
У закутку дзядзька цісне
Самагонку з бармуты.

А падлога, як зямліца--
Хутка вырасце трава.
За акном гудзе сталіца,
Ну а ў хаце — галава.

Пад сталом пустая сумка,
Рот разявіла і спіць...
Нехта скажа: «То прыдумка!
За яе пара садзіць!»

У адказ — адно што плюнуць.
Ды цярплівы ў нас народ.
Будавалі дом-камуну,
Выйшла ўсё наадварот.

**Балада душы**

Ён прачнуўся ў чарнюткім скляпенні
І адчуў, што не мае душы.
Як мяхі, разраслiся кішэні,
У кішэнях не грошы — глыжы.
Падмануў яго д’ябал п’янога,
І забраў сабе лёгка душу.
Ён жа грошай прасіў не так многа —
На білет — уцячы за мяжу.
Уцячы ад бяздушнае стыні,
Уцячы ад бясконцых пакут,
Быць бяспраўным у роднай Айчыне,
Дзе манкурты век чыняць свой суд.
Суд над праўдай, над мовай, над доляй,

Над штандарам, што ў юных руках...
Ды адсюль не ўцячы нам ніколі,
Як з турмы не ўцячы ў кайданах.
І забыў ён пра маці старую,
І забыў, што душу ён прадаў.
Ні пакут больш, ні болю не чуе,
Не хвалюе цяпер і бяда,
Што з Чарнобыля ветрам прыгнана.
Захацеў жа падняцца — не змог.
Закрычаў: — Ну за што пакараны,
Адкажы мне, забыты мной Бог?
У адказ не пачуў анічога
І не ўбачыў з цямнечы сырой,
Як ляцела душа аж да Бога,
Д'ябал гнаўся за ёй.

* * *

І плакаў вецер за дзвярыма,
Свой лёс бяздомны праклінаў.
Сава з жаўцюткімі вачыма
Сядзела паняй ля вакна.

Сядзела, нібы вартавала
Мяне ад чорных, страшных сноў.
Я ёй выносіў скрылік сала
І ў свой спакой вяртаўся зноў.

Агонь кіпеў у печцы белай,
Цяпло на рукі мне цякло.
Журба ў душы маёй кіпела,
Ператваралася ў святло.

Хадзілі цені за плячыма.
То цені светлых, добрых сноў.
І плакаў вецер за дзвярыма,
І ў хату горды не ішоў.

## Першы снег

Ад першага снегу святочна ў кватэры,
Ад першага снегу святочна ў душы.
І толькі за вокнамі дзень стаіць шэры,
Асьлеплены дымам заводаў, машын.

Я выйшаў на вуліцу, нібы на волю,
Я выйшаў адразу — у белы наш свет,
Дзе ходзіць па Мінску чужой мая доля,
І горад няшчасным і злосным заве.

На дрэвах старых затрымалася лісце,
Вароны на могілках тлумна крычаць.
Дурніцы вароны, вы так не крычыце,
За вамі, як падае снег, не чуваць.

## Нудота

Няўжо нам толькі плакаць па былым,
Перабіраць зжаўцелыя паперы?
Айчыны нашай горкі белы дым
Плыве — мы зачынілі шчыльна дзверы.

Завесілі счарнелае акно,
Нібы адмежаваліся ад свету.
Гарбату п’ём, раней пілі віно,
Чытаем, моцна лаючы, газету.

Жыццё ідзе... Якое тут жыццё!
Без болю, без надзей і без змагання.
І пад сталом і на стале смяццё,
І на душы смяццё... Чысцей ці стане...

Трымаемся адчайна за сталы,
Слюнява хвалім безнадзейна шэрых...
Няўжо нам толькі плакаць па былым,
Перабіраць зжаўцелыя паперы?

* * *

Стракатыя вітрыны магазінаў
Мільгаюць дрогка за акном таксі.
Блакітны снег запырскалі машыны
Расталым, вязкім студзенем гразі.

Таксіст нервова курыць цыгарэту,
На вуліцу праз фортачку плюе.
А я сціскаю, стомлены, газету,
Нібы трымацца ўзяўся за яе.

— Ну як дарогі? — распачну размову.
Таксіст павернецца, махне рукой,
І не пачую ад яго ні слова,
І буду як заляпаны гразёй.

Своечасова на вакзал прыеду,
Падзякую таксісту, дам на чай.
А ён спакойна кіне цыгарэту
І скажа мне банальнае: «Бывай...»

* * *

А так усё ціха, нібы на тым свеце.
Ды будзе, гаворац, тут горад і сад.
...У пляшку пустую пасвіствае вецер,
Былы камсамолец малюе плакат.

**Звіняць званы**

Ізноў звіняць званы, душа чысцее.
Хто ў Бога верыць, хто — у камунізм.
П’яны мужык спявае пра Расею —
Гарэлкі патрабуе арганізм.

А ля царквы метро трасе будовы,
Страсае пыл будзённасці і свят.
Ствараем свет прыгожанькі і новы,
Плакат здымаем, вешаем плакат.

Ідуць старыя — у царкву, да Бога.
Куды ж пайсці бязбожным грэшным нам?
У бруд, у блуд вядзе людзей дарога,
Калі ў дарогі адабралі Храм.

Ды ёсць пакуль што ў вечнасці надзея,
Што нас у Храм дарога прывядзе...
Звіняць званы, звіняць, душа чысцее.
І божы воблік бачыцца ў вадзе.

## ПА ДАРОЗЕ БЯСКОНЦАЙ, ЯК ВЕЧНАСЦЬ ЗЯМНАЯ

* * *

У краіне сну і чорных кратаў
Па дарозе, дзе, як вечнасць, пыл,
Я сустрэў вандроўных музыкантаў,
Што ішлі да дзедаўскіх магіл.

Ім абрыдлі шэрыя прасторы,
Ім абрыдлі панскія сталы.
Пагублялі лапці і аборы,
Напіліся брагі і смалы.

Я спытаў вандроўных музыкантаў:
— Што чакаць жа мне ў краіне сну?
Адказалі, што чакаць не варта
Радасці бясконцую вясну.

Не сказалі болей анічога
І пайшлі, як прывіды, як сон.
Я абняў, нібыта крыж, дарогу,
І пачуў я: у дарозе — стогн.

І ў краіне сну і чорных кратаў
Я пракляў сябе за свой спакой.
І ўздагон вандроўным музыкантам
Паляцеў, галосячы, душой.

**Пакутнік**

Сяргею Новіку-Пяюну

У небе Айчыны чарнюткія краты,
І чэрап у небе — не сонца — плыве.
Пры новай уладзе ён зноў вінаваты,
Што ён Беларусам з’явіўся на свет.
І гоняць ізноўку яго да магілы,
І дротам калючым прыгожыцца шлях.
І воранаў чорных чарнюткія крылы,
І белыя крылы анёлаў, і жах
Над шляхам яго, над людской непакорай.

І будзяцца песні пад звон кайданоў,
І будзяцца сілы, каб выжыць у горы,
Вярнуцца і ў гора патрапіць ізноў.
Навокал чарнеюць крывёю курганні,
І вёскі пустыя, і выюць ваўкі.
Ён помніць апошняе з маці спатканне,
І спадчыну дзеляць штодня чужакі.
І колюць штыкамі па-рабску у спіну
Служакі, што вераць у светлы прасцяг
І ў зорнае заўтра турэмнай Айчыны
І крочаць па братняй крыві і касцях.
Цяжэюць ватоўкі, звярэюць сабакі,
І холад, і голад збівае ўсіх з ног.
Смяротнікаў новых чакаюць баракі,
І ямы чакаюць — ля чорных дарог,
І працу чакаюць культурныя каты.
Душа паўтарае: «Айчына жыве!»
А ў небе Айчыны турэмныя краты,
І чэрап у небе — не сонца — плыве.

**Балада**

Яны прыйшлі, і ноч прыйшла сівая,
Іржалі коні іхнія ў цямнечы.
І чулі ўсе, як Хам п’яны спявае
Пра косы доўгія і белы плечы.
І ехалі чужынцы, і гарэлі
За імі слёзы, храмы і палацы.
І птушкі беларускія нямелі,
І ў кулакі зліліся пальцы.
І павылазілі з-пад пнёў вужакі.
Зляцеліся і ведзьмы, і вароны.
З тупых мячоў лізалі кроў сабакі,
І плыў у небе дым, як кроў, чырвоны.
І не было ратунку анікому,
Не чуў малітвы Бог пад чорным небам.
А хочаш жыць, дык кланяйся чужому
Гаспадару, вітай чужынца хлебам.
Ды косамі і віламі віталі
Чужынцаў, што з крывавымі рукамі.

І толькі служкі хамавы крычалі:
«Мы будзем вечна вашымі рабамі!
Наш родны край пры рабстве стане раем!"
...І людзі прывыкалі да пакутаў.
І хамскі крык ляцеў над белым краем
І ў душы бедныя ўлятаў атрутай.

* * *

Начнога вакзала гнілое паветра,
Бясконцае груканне цяжкіх дзвярэй.
Афішы, са сцен абарваныя ветрам,
Пад ногі кідаюцца мокрых людзей.
А дождж не сціхае. І столь працякае,
Калюжына ў зале расце і расце.
Высокі хіпак пад гітару спявае,
Заснуць не дае. На дварэ ў цемнаце
Стаяць за перонам пустыя вагоны.
Залезці б у іх ды салодка заснуць!
Ваду лейтэнант абтрасае з пагонаў,
Нібыта баіцца, што зоркі сплывуць.
Насупраць яго
маладая кабета
Рэкламна сумуе на цэлы вакзал:
То возьме часопіс, то возьме газету...
І ўжо лейтэнант: быццам бы генерал,
Сядае бліжэй, прапануе гарбату...
А побач вяскоўцы стамлёныя спяць,
Патрацілі грошай сягоння багата,
Ды толькі пакупак амаль не відаць.
Цыганскія дзеці па сонным вакзале
Шныруюць, як чэрці, і просяць рубля.
Капейку дасі — на капейку пахваляць
І зробяць за тройку з цябе караля...
Гляджу на гадзіннік, нібы на ікону.
Як штосьці святое, білет берагу.
А міма вакзала грукочуць вагоны,
І нашыя цені за імі бягуць.

* * *

Шчэ ёсць Беларусы, што верацць у Волю,
Іх Веру нікому, нічым не забіць...
А Ён памірае — такая ўжо доля,
Анёл па душу з Беларусі ляціць.

* * *

Людміле

І мы сустрэліся ля Вострай брамы,
Як толькі сонца зрэдзь пазалаціла
Крыжы цяжкія старажытных Храмаў.

Душу маю самота адпусціла,
І мы пайшлі па вузкіх вулках Вільні,
Што помняць крокі друкара Скарыны.

Як праз вякі, па бруку чорна-сінім
Ішлі, не адчуваючы чужыны,
Сярод муроў, дзе наша вечнасць спела.

І дзве манашкі лёгкаю хадою
Нас абагналі. Птушка праляцела,
Нібы анёл, над ціхаю царквою.

І знікла ў небе між аблок і дыму,
Што прыплылі з расійскага усходу,
Не помнячы галодную радзіму.

І закрычаць вар’яцкая ахвота
Душу маю, як воран, раздзірала:
— Люблю я Вільні векавую волю!

Ды я маўчаў, і радыё гарлала
Пра тое, што не вернуцца ніколі
Часы былыя і былыя ўлады.

А мы вярталіся да Вострай брамы
І ў душах неслі Волі братняй свята—
Крыжы цяжкія старажытных Храмаў.

* * *

Не люструецца неба ў змутнелай вадзе,
І ў канаве дарожнай канае вада.
І ніхто больш не едзе, ніхто не ідзе
Па забытай дарозе. Буяе жуда
Сакавітай, маўклівай, як вечнасць, травой.
А па гэтай дарозе імчалі вазы,
Уздымаючы грукат і пыл над сабой,
І ў прасторы звінелі людзей галасы.
Сёння тут гаспадарыць лагодная ціш.
Толькі ціш, як заўсёды — бязбожны спадман.
Да канавы з вадой прабіраецца мыш,
А за мышшу цікуе галодны груган.
...Не люструецца неба ў змутнелай вадзе.
І канае вада — адшумела вясна.
Тут ніхто больш не едзе, ніхто не ідзе —
Толькі вечнасць адна, толькі вечнасць адна.

* * *

Зноў агонь дагарае, цямнее наваколле,
І пара ўжо дахаты вяртацца ў святло.
І да нас ціха цягнецца чорнае голле
Дрэў шумлівых, што ловяць, як шчасце, цяпло.

А цяпло адлятае, губляецца ў небе,
Застаецца нам попел самотны і пыл
На цярплівай, скалечанай, стомленай глебе,
Дзе заўсёды ёсць месца для нашых магіл.

Патухае агонь, дым струменіцца белы,
І ляціць, і знікае, і кліча з сабой.
І душа, каб хацела, за ім паляцела...
Колькі дыму і душ над Айчынай маёй!

І патух наш агонь, і сцямнела ваколле,
І дахаты пара нам вяртацца даўно.
І паедзены хлеб, і папіта віно,
І ўсё бліжэй ля нас выгінаецца голле.

* * *

Агеньчык свечкі ў цемнаце трапеча,
Пакінуты ў царкве ля абразоў.
Журботны чалавек пайшоў у вечар,
Шукаючы спагаду і любоў.
Па цёмных вуліцах блукаюць цені,
Па цёмных вуліцах лятуць вятры.
І ўсе дамы, нібы турмы скляпенні,
Глядзяць на свет, замкнуўшыся знутры,
І не жадаюць слухаць анікога.
А ён ідзе, наіўны, малады,
Яшчэ ён верыць у людзей і Бога,
Не знаючы ні шчасця, ні бяды.

* * *

Сёння пуста ў магазінах.
Раздзірае сум душу.
Мне б з прыгожаю жанчынай
З'ехаць за мяжу.

А па радыё далдоняць:
— Пацярпіце, будзе лепш...
І каму патрэбен сёння
Гэты мой няшчасны верш?

**Вогнішча ля храма**

Разбітыя шыбы, сарваныя німбы,
І вецер гуляе па Храме пустым.
Анёлаў пакрыўджаных чуюцца ўсхліпы,
У небе пасеяўся з вогнішча дым.

Ля вогнішча скачуць сівыя вароны,
Спажывы шукаюць у кучах смяцця.
Ледзь дыхае вогнішча ротам чырвоным –
Сыходзяць апошнія хвілі жыцця.

Здзічэлы сабака з кустоў пазірае,
Праз вочы блішчыць залатая душа.

Каторы ўжо тыдзень ён смерці шукае,
Ды толькі няма каму й кінуць глыжа.

І сцежкі да Храма травой зарастаюць,
Маўчыць без'языкі патрэсканы звон.
Над Храмам забытым анёлы лятаюць,
З абпаленых скрыдлаў страсаючы сон.

* * *

Лес памёр. Неўзабаве за ім перасохне Крыніца,
І царыца Вужака ўцячэ ад бядоты ліхой.
Спее ў хмары чарнюткай над Лесам сухім бліскавіца,
А ў Айчыне няма Чалавека з жывою вадой.

**Балада разбойніка**

Паходня патухла, і ў цемры сырой
Гарланіў разбойнік, ад страху сагнуты.
Нядаўна яшчэ ён ішоў, як герой,
У пошуках скарбу, хваліўся пакутай,
Якую ў бядоце дурной перажыў.
Бядота з гультайства, бяднота рабоў
Душу прымушае гавець у няволі.
Нямнога патрэбна для рабскай душы:
Міраж абяцанняў, і звон медзякоў,
І песня аб лепшай нязведанай долі.
Ён вырваўся з рабства —
Застаўся рабом —
Галодны і біты, бязбожны і грэшны.
Ён раб жывата, ён памрэ дзіваком
Над кучай багацця, і смерць будзе смешнай
У гэтым скляпенні, дзе цвіль, павукі.
Паходня патухла ад подыху д'ябла,
І выпала шчасце з дрыжачай рукі —
Украдзены ключ ад крывавага скарба.
Разбойнікам быў, заставаўся рабом,
Слабейшых рабоў адпраўляў у магілу.
Ён поўзаў па брудзе за чорным ключом
І кляў сваю долю, нячыстую сілу.

І ключ адшукаў, і заплакаў, завыў,
І ў цемры папоўз, як слімак, да багацця.
А па-над скляпеннем
Анёл смерці плыў,
Чакаў небараку, слабога для шчасця.

**Паляванне на ведзьмаў**

Анатолю Сысу

Каб не страціць хамскае ўладанне,
Пачалі на ведзьмаў паляванне
Хамы, што сядзяць у кабінетах.
Можна паляваць і на паэтаў.
Не да смерці хамы забіваюць,
Раз разумны — дурнем выстаўляюць.
Раз рабом не стаў,— не стаў харошым,
Між сабой твае падзеляць грошы.
Хочаш жыць — маўчы, як без'языкі,
А найлепей сёння — будзь бязлікім.
І сядзяць па кабінетах хамы,
Гутараць пра грошы і пра крамы.
А Паэты ў бары эмігруюць,
Келіхі атрутныя цалуюць...
І начамі плачуць над паперай,
Вершы сачыняючы, і вераць
У сваё вялікае вяртанне...
Ды ідзе на ведзьмаў паляванне.
І ці хопіць таленту і сілы,
Каб пазбегнуць ранняе магілы.

* * *

Разбураны замак. Высокія травы.
У травах высокіх блукаюць самотна вятры.
І пыл падымаецца ў неба гаркавы,
Чырвоны, як кроў,
і бязважкі,
як водбліск зары.

На рэштках валоў разрастаюцца лозы,

Чакаюць чагосьці цяжкія на іх груганы.
Гнілое лісцё, як іржавыя лёзы
Мячоў паламаных, ляжыць ля разбітай сцяны.

Начамі на замчышчы плача князёўна,
І слёзы князёўны тугой напаўняюць прастор.
Ды плачу не чуе ніхто усё роўна —
Раве, завывае прагрэсу галодны матор.

Ад росаў атрутных згінаюцца травы,
І ў травах спакой свой знаходзяць бадзягі-вятры.
І пыл
падымаецца ў неба гаркавы,
Чырвоны, як кроў,
і бязважкі,
як водбліск зары.

* * *

Па дарозе бясконцай, як вечнасць зямная,
Скача коннік у замак, якога няма.
Ён вяртаецца з бітвы, ніхто не чакае,
Уладарыць жыццём раўнадушша зіма.
Ён нясе для князёўны сваю перамогу,
Ён каханне сваё да князёўны збярог...
...Зарасла да багатай капліцы дарога.
Дый капліцы няма. Толькі ведае Бог
Тое месца святое людскога спачыну,
Толькі ведае Бог, дзе стаялі дамы,
Скуль пайшлі бараніць ад чужынцаў Айчыну
І князі, і халопы. І Храм той нямы,
Што людзей абуджаў да любові, спагады,
Храм, дзе месца было, каб душою ажыць...
Скача коннік дадому, блішчаць яго латы,
І яго сустракаюць самотна крыжы
На кладах ля дарогі бясконцай, забытай.
— Што ж ты, вой, так спазніўся —
на сотні гадоў--
І Айчына твая прагуляна, прапіта
За сталамі тваіх неразумных братоў?
Толькі стомлены коннік не чуе нічога,

Ды пытанні ў яго ёсць свае да жывых.
Ён сустрэне мяне, ён сустрэне любога
І спытае за ўсё, і спытае за ўсіх.

* * *

Не сумуй, што ўжо вясна мінула.
Не сумуй, не ўсё шчэ адцвіло.
Зорка ў чорным небе мільганула,
І душу напоўніла святло.

Не хавайся ад сяброў за плотам,
І сцяжына ў сад не зарасце.
Будзе ўсё — і радасць,
і самота,
І ў кватэры кактус зацвіце.

* * *

Ад мітусні жыццёвае стамлёны
У свет пайду, дзе вечнасць і спакой.
І следам закрычаць з крыжоў вароны
— Чаго ты жыў і мучыўся душой?

Я не пачую крыку іх зямнога,
Таму й нічога ім не адкажу.
І па дарозе вечнасці да Бога
Я думаць буду, грэшны, пра душу.

Але жывы я думаю пра цела
І не шукаю ў вечнасці спакой.
І для мяне яшчэ ўсё зразумела:
Чаго жыву і мучуся душой.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

ЗМЕСТ

**Да Бога мая адлятала душа...**

Балада пра нешляхетнага пана
Балада карліка
Спальваньне ведзьмака
Балада здрадніка
Горад N, 20-я гады
Язэп Драздовіч
Балада апошняга рыцара, які трапіў у чарнобыльскую зону
Валуны
«За чорным полем белы Замак...»
Казка пра цмока
«У ката закахалася паненка...»
Казка пра ляльку
Карыта
Казка пра вераб'я

**Пакуль гарыць сьвечка**

Партрэт
Вежа
«губляюцца словы як залатоўкі...»
Кніга
Камень
Каваль
Калодзеж
Торба
«і прыйшоў Ён і сказаў Ён...»
«жыву сярод камянёў...»
Людзі і манекены
«ніколі да мяне ніхто не заходзіў...»
«бясконцы як вечнасьць дождж...»
«прысьніўся сон...»
«размываюцца сьцежкі магілы...»
«зямля ў сьмецьці дамы ў сьмецьці...»
«чорныя чорныя чорныя птушкі...»
Пакуль гарыць свечка
«і цемра як чорная багна...»
«у рыб вырасьлі крылы...»
Жаба
«перад вялікімі сьвятамі...»
«запрашаю ў госьці сяброў...»
На сьметні
Плот
«ля царквы старая прадае Біблію...»
«стаю пад вокнамі радзільнага дома...»
Дом
«вы ўсе сабакі...»

Вялікдзень
Навальніца
У падвале
«БОГ…»
Бяз знакаў прыпынку
Пасьля сьвята
Сьвятло сьвечкі
Два вершы
На дварэ
«і разьлілося чырвонае чырвонае віно…»
«і нічога мы не баімся…»
«у мае вокны глядзіць суседні дом…»
Могілкі
Цягнік
Яны і мы
Сьцены
Камяні
«са сьнегу зьляпіў чалавека…»
Ялінкі
«я ня веру ў Бога…»
Паштоўкі
У цемры
«мы адзьдзяляемся адзін ад аднаго…»
На раздарожжы

**Белы сьвет, дзе нам канаць**

«Мая Айчына стала палігонам…»
«Ён быў, ён ёсьць, ён вечна будзе…»
«Колькі прызнаньняў у шчырым каханьні…»
«Па горадзе ходзяць салдаты…»
«І лёс захлынуўся крывёю…»
Там
Партрэт
«Даўно няма між нас сьвятых…»
Наша восень
Манекеншчыца
«На гэтым сьвеце кожны — госьць…»
«На людным праспэкце ля шэрай сьцяны…»
У час зялёнага дажджу
Ціхае мястэчка
Яма
Сабака
Ваўкалака
Чалавек-рыба
«Вяртаюцца паэты зь небыцьця…»
«Няма Караткевічаў новых…»
«Паэта губіць геніяльнасьць адзіноты…»
Помста
Залатая карона зьмяі
«І трэснулі сьцены ў кватэрах…»

Камуналка
Балада душы
«І плакаў вецер за дзьвярыма...»
Першы сьнег
Нудота
«Стракатыя вітрыны магазінаў...»
«А так усё ціха, нібы на тым сьвеце...»
Зьвіняць званы

**Па дарозе бясконцай, як вечнасьць зямная**

«У краіне сну і чорных кратаў...»
Пакутнік
Балада
«Начнога вакзала гнілое паветра...»
«Шчэ ёсьць Беларусы, што вераць у Волю...»
«І мы сустрэліся ля Вострай брамы...»
«Не люструецца неба ў змутнелай вадзе...»
«Зноў агонь дагарае, цямнее навокальле...»
«Агеньчык сьвечкі ў цемнаце трапеча...»
«Сёньня пуста ў магазінах...»
Вогнішча ля Храма
«Лес памёр. Неўзабаве за ім...»
Балада разбойніка
Паляваньне на ведзьмаў
«Разбураны замак...»
«Па дарозе бясконцай, як вечнасьць зямная...»
«Не сумуй, што ўжо вясна мінула...»
«Ад мітусьні жыцьцёвае стамлёны...»

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год